КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №45 (129)
◂ 26 СНЕЖНЯ ◂ 2008 г.

# Новы Час



**УЗНАГАРОДА СВЯТОГА БРАТА АЛЬБЕРТА**

Стар. 4

**МЕТАМАРФОЗЫ 2008, НАДЗЕІ 2009...**

Наколькі праўду гавораць астролагі, калі апісваюць высакосны год як цяжкі і спрэчны, невядома. Але ўсё ж хочацца, каб 2008 год нарэшце сышоў у гісторыю і саступіў месца новаму 2009-му, свежым спадзевам і — няхай сабе! — нават расчараванням, але новым, без паху зляжаласці і старызны...

Стар. 5

**КАНЕЦ СВЕТУ**

Адключэнні гарачай вады і святла, абвал курсу нацыянальнай валюты, катаклізмы надвор'я, выбух крыміналу...

Стар. 12

**БУНТОЎНА**

Стар. 14

**ПАВАЖАНЫЯ ЧЫТАЧЫ!**

**У СУВЯЗІ СА СВЯТАМІ НАСТУПНЫ НУМАР «НОВАГА ЧАСУ» ВЫЙДЗЕ 16 СТУДЗЕНЯ 2009 ГОДА**

▸ АД РЭДАКЦЫІ

## НОВЫ ГОД — НОВЫ ЧАС

**Новыя чаканні, новыя спадзяванні на новыя сустрэчы, новыя здабыткі, новыя поспехі. Новае шчасце. Усё нядобрае — за спіной. Усё лепшае — наперадзе. Па два бакі ўмоўнай адзнакі на шкале часу. Так было здаўна, так ёсць цяпер, і так будзе заўжды.**



Новы год адзначалі і адзначаюць у розныя эпохі, у розных краінах, па розных календарах. Даты і лічбы, канцэпцыі і ідэалогія, каштоўнасці і культурны кантэкст, рытуалы і звычаі — розняцца. Глыбінны ж сэнс — з аднаго вытоку: умоўная дата як водгук на запатрабаванні душы чалавека ў аднаўленні, у пераменах да лепшага. Вакол сябе, да сябе і ў сабе. Менавіта так — па прыступках духоўнага росту. А ўжо хто на якой спыніцца, вызначаецца шэрагам залежнасцей, зноў жа — вакол сябе, да сябе і ў сабе. Залежнасці ад знешняга ціску. Ад суадносін спрыяльных і неспрыяльных акалічнасцей. Ад сям'і і сяброў. Выхавання і самавыхавання. Адукацыі і самаадукацыі. Ад характару і псіхалагічнага складу. Але ўрэшце ўсё залежыць ад сябе самога. Уласных волі і розуму. Ад Бога ў душы. Ну а Бог, як вядома, дапамагае тым, хто дзейнічае. Але не на шкоду іншым.

І таму падаецца такім сімвалічным супадзенне дзвюх дат — навагодняй і Божага Нараджэння.

На жаль, знешнія акалічнасці на скрыжаванні восьмага і дзявятага гадоў дваццаць першага стагоддзя не лепшыя. Навагодні феерверк высвечваецца на змрочным небасхіле крызісу. Глабальнага фінансавага і свайго айчыннага — эканамічнага і палітычнага. І ўжо адчуваецца яго сцюдзёны подых: растуць цэны, зніжаюцца заробкі, скарачаюцца працоўныя месцы, пачынаюцца звальненні…

Але ж, супакоім сябе, бывала і горш. І здаўна засведчана на скрыжалях гісторыі: правадыры прыходзяць і сыходзяць, рэжымы парахнеюць і рассыпаюцца пылам. Бо волю людзей да перамен, да лепшага, што канцэнтруецца з ходам часу ў магутную энергетычную плынь — не спыніць, не стрымаць. І лепшае настане. Будзем спадзявацца, што для нас усіх — ужо ў новым годзе.

Але так адбываецца толькі тады, калі чалавек не губляе веру ў сябе. Не ўпадае ў дэпрэсію. Акрэслівае лінію абароны. Трымаецца і супрацьстаіць. Пагрозам і абставінам, злому лёсу і нячыстай сіле.

Рэцэпты старыя, як свет, з года ў год. На тым і стаім. Узгадаем, што нам дае адчуванне камфорту, радуе і натхняе ў добрыя часы? Зразумела ж, найперш — добрае здароўе, спакой і мір сям'і, добрыя адносіны з блізкімі, прафесійныя поспехі, нармальны, а яшчэ лепш высокі ўзровень матэрыяльнага дабрабыту, упэўненасць у стабільнасці сітуацыі, адсутнасці пагроз звонку, якія ад цябе не залежаць.

Адсюль і нашы пажаданні на часы нядобрыя, нестабільныя, крызісныя. Таксама старыя, як свет. А значыць, і праверaныя часам, засведчаныя вопытам мінулых пакаленняў.

Не марнаваць дарэмна свой час, не апускаць рукі, не ўпадаць у адчай. Актывізавацца да найвышэйшага ўзроўню сваіх магчымасцей.

Не псаваць адзін аднаму нервы. Пытармазіць, як толькі засвярбіць увязацца ў бессэнсоўную сварку з любай, з добрым сябрам, з калегамі і апанентамі. Нішто не вартае страты дружбы, любві, кахання і проста добрых адносін з блізкімі табе людзьмі. Быць як ніколі чулліўвымі, каб адгукнуцца на покліч аб дапамозе родных яшчэ да таго, як ён прагучаў. З'яднацца ў сваім коле блізкіх табе людзей.

Нарэшце, калі задумацца, толькі салідарнасцю, узаемадапамогай сям'і, родных і блізкіх трымаецца дабрабыт кожнага з нас, а на гэтым — усяго грамадства, народа, краіны. І менавіта так пераадольваюцца цяжкасці нядобрых часоў, забяспечваецца выхад з крызісу.

З Божым Нараджэннем, з Новым годам Вас, дарагія чытачы, людзі зямлі беларускай!

ЗАКЛІК

# СВАБОДУ СМІ І АРГАНІЗАЦЫЯМ

**Міністэрства замежных спраў Чэхіі спадзяецца, што беларускі ўрад распачне наступныя крокі ў кірунку рэгістрацыі новых незалежных арганізацый і ўмацаванні свабоды СМІ.**

МЗС Чэхіі распаўсюдзіла тэкст заявы з нагоды рэгістрацыі ў Беларусі грамадскага руху «За Свабоду», узначаленага Аляксандрам Мілінкевічам, паведамляе «Інфарм Прага».

Дакумент вітае такога кшталту пачынанні, як дазвол на продаж незалежных газет «Народная воля» і «Наша Ніва» ў дзяржаўнай сетцы. Як паведамляе прэс-служба ведамства, гэта пазітыўны крок у кірунку пацверджання чаканняў з боку Еўрасаюза.

Міністэрства замежных спраў Чэхіі ў гэтай сувязі мае надзею на тое, што беларускі ўрад распачне наступныя крокі ў кірунку рэгістрацыі новых няўрадавых арганізацый і ўмацавання свабоды СМІ.

Гэтыя дзеянні неабходныя для наступнага збліжэння Беларусі і Еўрасаюза, у тым ліку і ў рамках адмысловай ініцыятывы ЕС па ўмацаванні еўрапейскага ўсходняга суседства. Адзначаецца таксама, што Чэхія мае намер у перыяд знаходжання на пасадзе краіны-старшыні ЕС максімальна спрыяць развіццю такога супрацоўніцтва.

АКЦЫЯ




# «СПЯШАЙСЯ РАБІЦЬ ДАБРО»

Генадзь КЕСНЕР

**У мінулую суботу стартавала кірмашом дабрачынная калядная кампанію «Спяшайся рабіць дабро», што ладзіцца зарэгістраваным у Чэхіі «Маладым Фронтам». Сродкі, сабраныя падчас акцыі, будуць перададзены ў дзіцячыя дамы і школы-інтэрнаты.**

Цягам некалькіх тыдняў да суботняй імпрэзы актывісты арганізацыі, у асноўным дзяўчаты, сваімі рукамі выраблялі розныя сувеніры, вязалі шалікі і пальчаткі, майстравалі елачныя цацкі ў нацыянальных колерах і з нацыянальнай сімволікай — усё гэта было выстаўлена і прадавалася на кірмашы.

Як адзначыла адна з арганізатараў акцыі Наста Палажанка, падрыхтоўка да гэтага каляднага фэсту ішла даволі складана, вымагала шмат часу. «Мы рабілі «складнік патрэбаў» па ўсіх дзіцячых дамах, абтэлефаноўвалі іх, заходзілі на іх сайты, і пасля гэтыя патрэбы мы разважалі ў інтэрнэце і па пунктах заклікалі людзей прыносіць пэўныя рэчы», — паведаміла намесніца старшыні «Маладога фронту».

Па словах Насты Палажанкі, людзі, якія хацелі дапамагчы, прынасілі канкрэтныя рэчы па патрэбах, сродкі асабістай гігіены, кнігі, цацкі, лялькі. «Гэта людзі, якія маюць жаданне дапамагаць і жадаюць накіраваць каму-небудзь сваю любоў, і тут мы даем гэтым людзям магчымасць рэалізавацца», — сказала актывістка.

Адкрываючы імпрэзу, лідэр маладафронтаўцаў Зміцер Дашкевіч падкрэсліў, што галоўнае — гэта не грошы, якія сабраныя і будуць перададзены дзецям, і не цацкі ды іншыя падарункі. «У першую чаргу важна чалавечае цяпло, якога так не хапае дзеткам, што знаходзяцца ў школах-інтэрнатах. І калі калядныя святы, калядная ноч у кожнага асацыюецца з сям'ёю, з сямейным цяплом, то ў гэтых дзяцей, на вялікі жаль, не хапае сям'яў, не хапае гэтага цяпла», — сказаў Зміцер Дашкевіч. Таму, па словах юнака, з 25 снежня да 7 студзеня — ад каталіцкіх Калядаў да праваслаўных маладафронтаўцы будуць наведваць дзіцячыя ўстановы ў Мінску і іншых гарадах Беларусі і перадаваць дзецям падарункі, сярод якіх ёсць і дыскі з беларускай музыкай, казкамі, дзіцячымі мастацкімі і мультфільмамі, і нават аўдыёплэеры ды якасная вопратка.

На дабрачынным кірмашы былі не толькі маладзёны, але і людзі старэйшага пакалення. «Дужа прыемна тут, так па-сямейнаму, аўра, як цяпер кажуць, такая станоўчая, — сказала жанчына пенсійнага веку. — Вельмі кранальна, што яны, як старэйшыя браты і сёстры, робяць нешта прыемнае і добрае для гэтых бедных дзетак».

Арганізатары дзякавалі прысутным за ахвяраванні і частавалі ўсіх гарбатай з печывам і цукеркамі. Перад гасцямі і ўдзельнікамі выступілі гомельскі бард Андрэй Мельнікаў і вядомы рок-музыка Піт Паўлаў. Пры канцы мерапрыемства прысутныя разам праспявалі гімн «Магутны Божа» на верш беларускай паэткі Наталлі Арсенневай.

КАНФЕРЭНЦЫЯ

# КАЛІНОЎЦЫ Ў БЕЛАСТОКУ

Эла ОЛІНА

**У Беластоцкім універсітэце адбылася навукова-практычная канферэнцыя беларускіх студэнтаў, што навучаюцца ў польскіх ВНУ па праграме Каліноўскага. На сённяшні дзень гэта 218 чалавек.**

У канферэнцыі прынялі ўдзел старшыня Камітэта абароны рэпрэсаваных «Салідарнасць» Іна Кулей і лідэр грамадскага руху «За Свабоду» Аляксандр Мілінкевіч.

Іна Кулей заклікала студэнтаў праяўляць больш грамадскай актыўнасці: ладзіць у сваіх універсітэтах беларускія дні з запрашэннем пісьменнікаў, музыкаў і мастакоў з Беларусі, браць удзел у літаратурна-мастацкім конкурсе «Еўропа вачыма беларуса», распачаць кампанію супраць крымінальнага пераследу моладзевых актывістаў, у тым ліку 29 каліноўцаў, якія з гэтай прычыны ўжо больш за два гады пазбаўлены магчымасці прыехаць у Беларусь. Лідэры моладзевых ініцыятыў у асяродку каліноўцаў падтрымалі гэтыя прапановы.

Па завяршэнні канферэнцыі стыпендыяты разам з прадстаўнікамі Бюро Праграмы імя Каліноўскага ажыццявілі паездку на радзіму Кастуся Каліноўскага — вёску Мастаўляны, што недалёка ад Беластока, дзе ўсталявалі памятны знак аб намеры ў далейшым паставіць помнік беларускаму змагару.

ПЕРАСЛЕД

# ЗВОЛЬНІЛІ ДЭПУТАТА

Язэп ПАЛУБЯТКА

**Адміністрацыя прадпрыемства ААТ «Мастоўдрэў» не падоўжыла кантракт з перакладчыкам аддзела знешніх эканамічных сувязяў, дэпутатам раённага савета Дзмітрыем Кухлеем.**

На працягу ўсіх шасці год працы Дзмітрый не меў ні адной заўвагі, характарызаваўся як адзін з найлепшых спецыялістаў. Насуперак заканадаўству кантракт быў скасаваны ў выходны дзень — 21 снежня.

На думку Дзмітрыя Кухлея, яго звальненне — звычайны палітычны пераслед. Ён — адзін з заснавальнікаў «Маладога фронту» на Мастоўшчыне, мае актыўную грамадзянскую пазіцыю як дэпутат мясцовага савета, вылучаўся кандыдатам у дэпутаты на апошніх парламенцкіх выбарах. Колькасць подпісаў у яго падтрымку перавышала норму амаль у два разы, але выбарчая камісія адмовіла яму ў рэгістрацыі на той падставе, што подпісы, сабраныя яго ініцыятыўнай групай, быццам бы не сапраўдныя.

АД РЭДАКЦЫІ

# ПАМЯЦІ АМБАСАДАРА ЭБЕРХАРДА ХАЙКЕНА

**Прыйшла сумная вестка: у ноч з 20 на 21 снежня на 74-м годзе жыцця памёр Эберхард Хайкен, кіраўнік місіі АБСЕ ў Беларусі з 2003 па жнівень 2005 года.**



Інфаркт. Не вытрымала сэрца. Сэрца, шчодрае на дабрыню, чулліва да чужой бяды. Не па абавязку службы, па пакліканню душы. Ведаем гэта з уласнага досведу. Калі 25 сакавіка 2005 года група міліцыянтаў і невядомых людзей у штацкім учыніла ператрус у рэдакцыі газеты «Згода», то літаральна адразу ж патэлефанавалі з офіса АБСЕ з просьбай ад кіраўніка місіі прыехаць да нас у рэдакцыю. І менавіта ў рэдакцыі ён зрабіў заяву у абарону нашай газеты, у абарону свабоды слова ў Беларусі. І няма сумнення, што менавіта гэты крок прадстаўніка еўрапейскай супольнасці паўплываў на перакваліфікацыю заведзенай было крымінальнай справы на адміністрацыйную.

Як няма сумневу, што менавіта адстойванне правоў чалавека на атрыманне і распаўсюджванне інфармацыі сп. Хайкен лічыў адным з прыярытэтных накірункаў сваёй дзейнасці. Вольныя размовы з ім у неафіцыйнай абстаноўцы за абедамі ў клубным пакоі місіі АБСЕ да гэтага часу ўзгадваюцца рэдактарамі СМІ. Прычым не толькі незалежных, на абеды запрашаліся таксама журналісты дзяржаўных выданняў. Зрэдку нехта з іх асмельваўся завітаць на сустрэчу. У больш шырокім кантэксце місіі ў Беларусі амбасадар сп. Хайкен быў адным з першых з еўрапейскіх палітыкаў, хто імкнуўся ўвесці ў практыку адносін з беларускім грамадствам дыялог. На прынцыповай аснове дэмакратычных каштоўнасцей і павагі да апанентаў.

Вопытны дыпламат, шырокаадукаваны інтэлектуал, асветнік па пакліканню, шчыры сябра Беларусі, што палюбіў яе і шчыра зычыў ёй дабра, — такім нам запомніцца Эберхард Хайкен.

SOS

# ВЫРАТУЙЦЕ ЖЫВЁЛ!



**ГП «Фауна города» на Гурскага, 42, займаецца адловам і ўтрыманнем бездаглядных жывёл.**

**Зараз тут знаходзяцца больш за 100 сабак і 70 катоў. Амаль усе сабакі прывучаны да выгулу, а каты — да туалету.**

**Ва ўсіх іх ёсць толькі 5 дзён, каб знайсці сваё шчасце. А для шчасця гэтым жывёлам патрэбна зусім мала — маленькі куток у вашым доме і вашым сэрцы.**

**Новы год — час цудаў!**

**Кожны можа сам стварыць гэты цуд і падараваць шчасце бездаглядным жывёлам.**

**Падаруй ім цуд!**

**Кантактны тэлефон: (+375 29) 629 20 42.**

ПАРТЫІ

# АЛЯКСАНДР КАЗУЛІН РАЗЫШОЎСЯ З БСДП (ГРАМАДА)

Вольга ХВОІН

**Экс-кандыдат на пасаду прэзідэнта, былы палітвязень Аляксандр Казулін выйшаў з Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада). Пра сваё рашэнне ганаровы старшыня партыі паведаміў 21 снежня на пасяджэнні Цэнтральнага камітэта БСДП (Грамада). Бліжэйшым часам палітык плануе распачаць паездкі па краіне.**



Палітык заявіў, што выхад з партыі — гэта лагічны крок падзей гэтага года, рыса пад пэўным этапам жыцця. Цяпер яно пачнецца «з чыстага аркуша». Акрамя Аляксандра Казуліна, пра свой сыход з партыі заявілі Аляксей Кароль, Уладзімір Нісцюк і дачка ўжо былога кіраўніка БСДП (Грамада) Вольга Казуліна.

Аляксандр Казулін катэгарычна не пагаджаецца з заявамі цяперашняга кіраўніка партыі Анатоля Ляўковіча наконт таго, што асабіста яму партыя была патрэбная для вылучэння ў кандыдаты на пасаду прэзідэнта. «Людзі, якія ў тым ліку сёння знаходзяцца ў кіраўніцтве партыі, у свой час прасілі мяне аб'яднаць партыю і надаць ёй нармальны выгляд. Я вельмі многа аддаў партыі, і тыя, хто ў ёй знаходзіцца, добра гэта ведаюць», — гаворыць палітык. Акрэсленасці ў бліжэйшай палітычнай будучыні Аляксандра Казуліна, прынамсі для шырокіх колаў людзей, пакуль нябачная. «Я не сыходжу з жыцця. І гэта галоўнае, — падкрэсліў былы палітвязень. — Жыццё шматграннае і палітыкай не абмяжоўваецца». Былы рэктар БДУ таксама абверг чуткі пра тое, што яму прапанавалі працу ў Еўрапейскім гуманітарным універсітэце ў Літве.

Па меркаванні Аляксея Караля, ва ўмовах аўтарытарнага рэжыму любая з апазіцыйных партый падвяргаецца сур'ёзнай рызыке маргіналізацыі. З аднаго боку, пад ціскам рэпрэсій з боку ўлады. З другога — пад уплывам дэфармацыі ўнутрыпартыйнай палітыкі кіраўніцтва партыі, якое імкнецца застацца на пасадах любой цаной.

Так адбылося, на вялікі жаль, у БСДП. На чале з Аляксандрам Казуліным партыя правяла моцную прэзідэнцкую выбарчую кампанію, чым заваявала аўтарытэт і вядомасць у грамадстве. Аляксандар Казулін зрабіўся сцягам агульнадэмакратычнага руху да перамен.

Аднак у самой партыі частка кіраўніцтва на чале з Анатолем Ляўковічам толькі імітавала барацьбу за вызвалення свайго лідэра. Праз інтрыгі, ілжу, падтасоўкі, працэдурныя маніпуляцыі з рэгістрацыяй з БСДП былі выцеснены і выключаны самыя актыўныя арганізацыі і сябры партыі, якія мелі іншы пункт погляду, чым Ляўковіч і яго бліжэйшае атачэнне.

Усё гэта выклікала ўнутры партыі глыбокае абурэнне, расчараванне і адыход ад актыўнай дзейнасці яшчэ часткі яе сяброў. Пазітыўная дзейнасць партыі сышла амаль да нуля. Сама партыя БСДП і прозвішча Ляўковіч усплываюць у СМІ амаль што выключна ў сувязі з імем Казуліна. Ад партыі застаўся толькі брэнд для абслугоўвання палітычных амбіцый вузкай групоўкі. Аднак, лічыць А. Кароль, новы этап станаўлення беларускай шматпартыйнасці, у тым ліку БСДП, у новым фармаце, з новымі лідэрамі не за гарамі.

Алег Трусаў — старшыня Таварыства беларускай мовы, адзін з тых, хто спрычыніўся да заснавання ў Беларусі сацыял-дэмакратыі, лічыць, што далейшая палітычная кар'ера Казуліна залежыць толькі ад яго самога. «Казулін мусіць стаць на беларускі грунт: засвоіць мову, ідэі, адмовіцца ад трэцяга шляху, — называе складнікі поспеху палітыка старшыня ТБМ. — Перамагчы можна толькі на грунце беларускай ідэі. Прычым рабіць гэта трэба хутка, цягам бліжэйшых паўгода. Мілінкевіч ужо падобную кампанію арганізуе. У гісторыі Аляксандр Казулін, безумоўна, застанецца як вязень сумлення, як фігура, але ці застанецца як дзейсны палітык — толькі ад яго залежыць».

«Аляксандру Казуліну варта пазбавіцца ілюзій, што характэрныя людзям, якія толькі прыйшлі ў палітыку, — адзначае спадар Трусаў. — Яны прыходзяць з думкамі, што старая апазіцыя кепская, а вось цяпер усё зменіцца. Гэтая хвароба была і ў Мілінкевіча, і ў Марыніча. У выніку такіх апантаных ідэаламіі людзей акружаюць авантурысты, якіх больш цікавіць фінансавае забеспячэнне. Пасля наваяўленых лідэраў, як гаворыцца, «кідаюць», што і адбылося з Казуліным». Алег Трусаў падкрэслівае, што зняццё Аляксандра Казуліна з пасады старшыні без яго прысутнасці — надзвычай амаральны ўчынак: «Вядомасць партыі, міжнародная ўвага да яе найперш абумоўленыя лёсам экс-кандыдата ў прэзідэнты. Калі б Казулін у турме не сядзеў, то хіба Ляўковічу Буш цісну бы руку на прыёме ў Белым доме? Увогуле, зорка Анатоля Ляўковіча як палітыка закацілася, нават не ўзышоўшы. Хутка на яго месца прыйдуць новыя людзі».

Што тычыцца цяперашняй сітуацыі ў беларускай сацыял-дэмакратыі, то Алег Трусаў не бачыць вялікай бяды ў існаванні некалькіх партый: «У нашай краіне ўсе падзеленыя — пісьменнікі, палітыкі, музыкі. Гэта палітыка цяперашняй улады. А спрыяюць гэтаму і спецслужбы, і амбіцыі маленькіх царкоў. Калі з'явіцца перспектыўны лідэр, ён зможа ўсіх аб'яднаць вакол сябе. Думаю, наступны год — год вялікіх пераменаў».

Нагадаю, калі Аляксандр Казулін знаходзіўся ў калоніі, 3 жніўня ў Мінску адбыўся пазачарговы з'езд Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада). На ім планавалася зацвердзіць патэнцыйных кандыдатаў ад партыі для ўдзелу ў парламенцкіх выбарах. Аднак нечакана высілкамі кіраўніцтва з'езду быў нададзены поўнафарматны характар. У прыватнасці было пераабрана кіраўніцтва. Новым старшынём партыі стаў Анатоль Ляўковіч, які да той пары выконваў абавязкі старшыні. Аляксандра Казуліна зрабілі ганаровым старшынёй партыі. Тады паплечнікі і апаненты Казуліна па палітычнаму цэху асудзілі ўчынак Ляўковіча, які фактычна за спіною існага кіраўніка партыі арганізаваў ратацыю кіраўніцтва.

ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# У НОВЫ ГОД — БЕЗ КЛАПОТ

Сяргей САЛАЎЁЎ

**У Новы год — без клапот. Можна падумаць, што менавіта гэты дэвіз выбралі беларускія ўлады для таго, каб падвесці рысу пад старым годам і пачаць новы са стабільнасці.**

Умовы пастаўкі газу абмяркоўваліся ў ходзе беларуска-расійскіх перамоў на вышэйшым узроўні ў Маскве 22 снежня, аднак вынікі перамоў не паведамляліся. Як расказала БелаПАН інфармаваная расійская крыніца, у першым квартале 2009 года цана на газ можа скласці 160–170 долараў за тысячу кубаметраў. У найбліжэйшыя дні, паводле інфармацыі крыніцы, у Маскву накіруецца дэлегацыя на чале з першым віцэ-прэм'ерам Беларусі Уладзімірам Сямашкам, якая павінна канчаткова ўзгадніць цану і дакументальна аформіць газавыя дамоўленасці паміж Масквой і Мінскам. Пакуль ніякіх дамоў не падпісана, аднак кіраўніцтва Беларусі з аптымізмам глядзіць у будучыню.

На працягу 2009 года цана на расійскі газ для Беларусі будзе зніжана ў 2,5–3 разы. Пра гэта заявіў Аляксандр Лукашэнка, адказваючы вечарам 23 снежня на пытанні журналістаў у Бярозе (Брэсцкая вобласць), дзе ён браў удзел у цырымоніі адкрыцця новай лядовай арэны. «Цана на газ для Беларусі будзе падаць. З 1 студзеня да 31 снежня 2009 года яна значна ўпадзе, прыкладна ў 2,5–3 разы, і ў сярэднім у гэтым годзе будзе прымальнай для нас», — цытуе прэзідэнта дзяржаўнае агенцтва БелТА.

Гэта значыць, што журналісты, хутчэй за ўсё, застануцца без стаўшай ужо традыцыйнай зімовай «газавай вайны» паміж Мінскам і Масквой. Гэта, канешне ж, звычайных грамадзян не можа не радаваць. Яны без праблем пасмажаць шкварку да навагодняга стала і падымуць чарку, слухаючы віншаванні прэзідэнта.

Дый без падарункаў беларусы таксама не застануцца. Кампраміснае рашэнне захаваць наяўны прынцып падаткаабкладання прадпрымальнікаў прынята 23 снежня на нарадзе ў Аляксандра Лукашэнкі па пытаннях рэгулявання прадпрымальніцкай дзейнасці. Пры гэтым павышальны каэфіцыент 1,5 да адзінага падатку, які прымяняецца да замежных тавараў, што ўвозяцца з Расіі ва ўмовах адсутнасці мытнага афармлення, будзе павялічаны да 2. Павысяцца таксама верхнія значэнні ставак адзінага падатку.

Прадпрымальнікі па-ранейшаму змогуць выбіраць розныя спосабы выплаты падаткаў: агульную сістэму падаткаабкладання, якой прытрымліваецца пераважная колькасць юрыдычных асоб, спрошчаную сістэму або сістэму выплаты адзінага падатку. Пры ўвозе запасных частак да аўтамабіляў прадпрымальнікі будуць выкарыстоўваць агульную сістэму падаткаабкладання або спрошчаную, але не выплату адзінага падатку. Падрыхтаваны праект указа па ўдасканальванні сістэмы падаткаабкладання прыватных унітарных прадпрыемстваў, што «як істотна спрашчае яе, так і зніжае самі стаўкі падаткаў».

Тэрміны дзеяння новай сістэмы не ўстаноўлены. Гэта дае прадпрымальнікам спадзяванне на тое, што такая сістэма захаваецца назаўсёды. Нават пры павелічэнні каэфіцыенту адзінага падатку, — прадпрымальнікі свайго ўсё ж, можна лічыць, дамагліся. Такім чынам, запланаваныя на сярэдзіну студзеня акцыі пратэсту прадпрымальнікаў таксама скасоўваюцца.

Прынята рашэнне аб будаўніцтве беларускай АЭС на Астравецкай пляцоўцы, паведаміў 19 снежня на пасяджэнні Нацыянальнага савета па працоўных і сацыяльных пытаннях першы намеснік прэм'ер-міністра Уладзімір Сямашка. Больш за тое: улады нават амаль вызначыліся, хто будзе будаваць і саму беларускую АЭС. Генеральны падрадчык будаўніцтва беларускай атамнай электрастанцыі будзе вызначаны шляхам прамых перамоў. Пра гэта на прэс-канферэнцыі ў Мінску 24 снежня паведаміў дырэктар дэпартамента па развіцці ядзернай энергетыкі Міністэрства энергетыкі Беларусі Мікалай Груша. Паводле яго слоў, у пачатку 2009 года пройдуць перамовы з карпарацыяй «Росатам», на якіх будуць абмеркаваны ўсе ўмовы будаўніцтва АЭС.

М. Груша нагадаў, што ў 2008 годзе Беларусь накіравала найбуйнейшым міжнародным карпарацыям, якія спецыялізуюцца на будаўніцтве ядзерных блокаў, прапановы ўзяць удзел у тэндэры па будаўніцтве АЭС. Самы канкрэтны адказ, паводле яго слоў, даў расійскі бок. «Ён гатовы прадаставіць Беларусі патрэбны праект і гарантуе фінансаванне гэтых работ», — сказаў спецыяліст.

І яшчэ адна добрая навіна. Тры музыканты легендарнага беларускага ансамбля «Песняры» Леанід Барткевіч, Анатоль Кашапараў і Алег Молчан прынялі рашэнне аб'яднаць творчыя намаганні напярэдадні будучага 40-годдзя гурту. Артысты плануюць ствараць новыя праграмы, прыцягваць да ўдзелу ў іх сваіх сяброў і калег, якія найбольш ярка зарэкамендавалі сябе за гады працы ў ансамблі і зрабілі свой творчы ўнёсак.

«Ансамбль «Песняры», — расказвае Барткевіч, — праславіў беларускую песню на ўвесь свет. Хацеў бы нагадаць, што «Песняры» першымі з прадстаўнікоў пасляваеннай савецкай эстрады выступілі ў ЗША. Амерыканская публіка апладзіравала нам стоячы. Некаторыя гэтак званыя «зоркі» жадаюць забыцца на сапраўдную гісторыю легендарнага ансамбля, але пры гэтым карыстаюцца яго творчай спадчынай. Мы аб'ядноўваемся не дзеля бізнесу, а для таго, каб перадаць наш вопыт і творчую спадчыну маладым талентам, якія ведаюць і помняць нашы песні, уключаючы беларускі дзяржаўны ансамбль «Песняры».

Хто ведае, можа, у канцэрт на Новы год мы пачуем тых самых, легендарных?

МЕДАЛЬ

# УЗНАГАРОДА СВЯТОГА БРАТА АЛЬБЕРТА

**16 снежня Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч у Варшаве (Польшча) атрымаў ганаровы медаль імя св. брата Альберта — за пастырскую, дабрачынную і экуменічную дзейнасць. На заканчэнне цырымоніі Мітрапаліт Тадэвуш падзякаваў за прэстыжную ўзнагароду і дадаў, што прысвячае яе Касцёлу на Усходзе, дзе ён служыць.**



Медаль імя св. Альберта прызначаецца ў галінах сакральнай архітэктуры, жывапісу, дэкаратыўнага рамяства, рэлігійнай музыкі, літаратуры, тэатральнай і кінатворчасці, дабрачыннасці, эканамічнай і гаспадарчай дзейнасці. Праз узнагароджванне Фонд імя св. брата Альберта мае на мэце распаўсюджванне хрысціянскіх і гуманістычных каштоўнасцяў. Падчас сустрэчы з журналістамі ў Курыі 19 снежня Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч распавёў журналісту «НЧ» **Аляксею Хадыку** пра гэту важную падзею.

— 16 снежня 2008 у Варшаве адбылося ўручэнне ўзнагародаў св. брата Альберта. Было прызначана 11 узнагародаў — 10 асабістых і адна для арганізацыі. Сярод лаўрэатаў вылучу прадстаўніка Маскоўскага патрыярхату Валерыя Аляксеева, свецкага чалавека — што таксама вельмі важна, — якога я добра ведаю. За што выбралі мяне? У лісце ўзнагароды было напісана «за пастырскую і дабрачынную дзейнасць». З замежнікаў узнагароду атрымала таксама французская правінцыя езуітаў.

Узнагароды св. брата Альберта даюцца за экуменічную і дабрачынную дзейнасць, за развіццё хрысціянскай культуры… Фундацыя была заснаваная ў Польшчы і існуе ўжо 33 гады, адпаведна, зараз адбывалася 33-е ўручэнне. Сярод адзначаных узнагародай раней ёсць блаславёная маці Тэрэза з Калькуты, Мітрапаліт Мінскі і Слуцкі Філарэт, сённяшні месцаахоўнік Маскоўскага патрыярхату мітрапаліт Кірыл. Калі апошняга ўганаравалі медалём падчас майго служэння ў Маскве, гэта ўзнагароджанне сталася вялікай падзеяй у праваслаўным свеце Расіі. Шэраг кардыналаў каталіцкага касцёлу таксама маюць гэтую ўзнагароду. Свой медаль я хачу прысвяціць не сябе, а Касцёлу, якому я служу, — Касцёлу на Усходзе. Ён усё яшчэ адраджаецца пасля трох пакаленняў пераследу, ён выказаў мужнасць, нават да праліцця крыві падчас рэпрэсій, і таму заслугоўвае ўзнагароды. Бо Касцёлу патрэбныя і хрысціянскае сведчанне, і дабрачыннасць да людзей: касцёл адкрыты — і да каталікоў, і да праваслаўных, і да пратэстантаў, ён не дзеліць людзей на веруючых і няверуючых. Бо калі чалавеку баліць — яму баліць роўна, незалежна ад фармальных адрозненняў. У нашых абставінах, калі жывеш на Усходзе — ці то ў Беларусі, ці то ў Расіі, — экуменічны аспект вельмі важны. Думаю, што ўзнагарода св. брата Альберта, якую далі мне, пашырыць знаёмства Захаду з Беларуссю. Вельмі важна, што і прадстаўнік Маскоўскага патрыярхату быў узнагароджаны: у Варшаве ўсіх кранула, калі мы з ім прывіталіся па-руску. Мы хочам жыць разам, і трэба чыніць дзеля гэтага ўсё магчымае. Гэта мае вялікае значэнне і для Беларусі. Таму, калі я атрымліваю ўзнагароду — частка яе значэння пераходзіць на нашу краіну, якой я прысвячаю гэты гонар.

ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫЯ

# СУСТРЭЧА З ЖУРНАЛІСТАМІ

Аляксей ХАДЫКА

**19 снежня ў Мітрапалітальнай курыі ў Мінску адбылася калядная сустрэча Мітрапаліта Мінска-Магілёўскага арцыбіскупа Тадэвуша Кандрусевіча з прадстаўнікамі сродкаў масавай інфармацыі.**



Мітрапаліт Тадэвуш звярнуўся да прысутных з прывітальным словам, падчас якога падвёў вынікі дзейнасці Касцёла на Беларусі ў 2008 годзе і падзякаваў усім прысутным журналістам за асвячэнне гэтых падзеяў у СМІ. Арцыбіскуп распавёў пра сваё апошняе замежнае падарожжа і ўдзел у экуменічным каталіцка-праваслаўным форуме ў Трэнта (Італія). Мітрапаліт падкрэсліў, што такое важнае і актуальнае пытанне, як аднаўленне асноўнай ячэйкі грамадства — сям'і, — можа стаць добрай глебай для супольнага служэння Цэркваў. Тадэвуш Кандрусевіч узгадаў, што, стоячы разам з іншымі іерархамі Каталіцкага Касцёла і Праваслаўнай Царквы пад крыжам у той зале, дзе ў XVI стагоддзі праходзіў Трыдэнцкі Сабор (1545–1563), ён думаў пра тое, што гэты ж Хрыстос больш за 400 гадоў таму пазіраў з крыжа і на айцоў Сабора.

Была закранута праблема працы ў Беларусі святароў з Польшчы. Арцыбіскуп Тадэвуш адзначыў, што пакліканне да святарскага служэння — Божы дар. Немагчыма заахвоціць чалавека прысвяціць жыццё асабліваму служэнню Богу, і па прычыне нешматлікіх пакліканняў з Беларусі Касцёлу ў нашай краіне патрэбна дапамога з-за мяжы.

«З прычыны, што высылаюць каталіцкіх святароў (у гэтым годзе не працягнутыя візы трох служыцеляў царквы ў Гродзенскай епархіі), найперш цярпяць вернікі, — заявіў Тадэвуш Кандрусевіч. — У Беларусі нестае каталіцкіх святароў. У дадзены момант іх 440. А ў краіне 1,5 мільёна католікаў. Ідэальнай лічбай было б 1 святар на 1 тысячу прыхаджан. Але мы не кажам нават і пра тысячу служыцеляў каталіцкай царквы, марым дасягнуць хаця бы лічбы 700».

Не так даўно арцыбіскуп звярнуўся з афіцыйнай просьбай пра дапамогу ў гэтай праблеме да Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Славакіі — «ніхто не ставіць задачу, каб святары прыязджалі ў Беларусь менавіта з Польшчы». З другога боку, «прырода не трывае пустаты: калі не будзе нас, прыйдзе нехта іншы». Мітрапаліт, са шкадаваннем адзначыў хуткае распаўсюджанне ў краіне дэструктыўных сектаў.

Перад традыцыйным ламаннем аплаткі быў зачытаны ўрывак са Святога Пісання, у якім распавядаецца пра Нараджэнне Ісуса Хрыста. Мітрапаліт нагадаў пра сапраўдны сэнс Адвэнту — радаснага чакання Нараджэння Ісуса Хрыста, — які заключаецца перадусім у духоўнай, а не толькі матэрыяльнай падрыхтоўцы. «У інтэрнэце па пошуку я дзеля цікавасці задаў слова «Адвэнт» і атрымаў наступнае тлумачэнне: «Адвэнт — гэта гукі званочкаў і… стракатанне касавых апаратаў», — пажартаваў арцыбіскуп.

Затым удзельнікі каляднай сустрэчы падзяліліся аплаткаю і скіравалі адно аднаму пажаданні з нагоды надыходзячых святаў.

З НАГОДЫ

# БОГ ПРЫЙШОЎ ДА НАС У ВОБРАЗЕ ЧАЛАВЕКА

## З ПАСТЫРСКАГА ПАСЛАННЯ НА НАРАДЖЭННЕ ПАНА



**Не бойцеся, я абвяшчаю вам вялікую радасць: нарадзіўся вам сёння ў горадзе Давіда Збаўца, якім ёсць Хрыстус Пан (пар. Лк. 2, 10–11).**

Глыбокапаважаныя браты ў святарстве, шаноўныя законнікі і законніцы, умілаваныя браты і сёстры! Гэтымі словамі, з якімі Анёл звярнуўся да пастушкоў, ад усяго сэрца вітаю вас ва ўрачыстасць Божага Нараджэння. Словы гэтыя адлюстроўваюць асноўны сэнс сённяшняга свята, бо абяцаны Богам Айцом яшчэ нашым прабацькам Адаму і Еве, прадказаны прарокамі, доўгачаканы Збаўца нарэшце прыйшоў у гэты свет — прыйшоў у вобразе звычайнага чалавека…

…Доўгія тысячагоддзі чалавецтва чакала Божага госця, які змог бы адказаць на пытанні, што яго хвалявалі. Сённяшняя ноч Божага Нараджэння сведчыць пра тое, што ўжо больш не трэба чакаць. Да нас прыйшоў не проста нейкі прышэлец, не іншапланецянін, але хтосьці значна больш — прыйшоў сам Бог; прыйшоў, каб дапамагчы загубленаму ў гэтым свеце чалавеку знайсці Яго і зразумець самога сябе. Ён, які існуе спрадвеку, прыйшоў у гэты свет у канкрэтную пару, калі, як гаворыць святы Апостал Павел, надышла паўната часу (пар. Гал.4, 4). Ён, Якога не можа агарнуць увесь Космас, нарадзіўся ў канкрэтным месцы — у невялічкім мястэчку Віфлееме. Ён, бясконца вялікі, стаўся маленькім бездаможным немаўляткам, каб нас зрабіць вялікімі. Ён сышоў з неба на нашу зямлю, каб нас узнесці на нябёсы. Ён стаўся падобным да людзей (пар. Флп. 2, 7), каб мы, абагаўляючыся Божаю ласкаю, прыпадобніліся да Яго. Ён уцелавіўся, прыняў вобраз нашага падданага цярпенню цела, каб узяць на Сябе нашы цяжкасці (пар. Мц. 8, 17; Гал. 6, 2) і такім чынам палегчыць іх…

…Жадаю вам радасці ў нованароджаным Месіі! Няхай Ён сваёю ласкаю заўсёды нараджаецца ў нашых сэрцах. Не трэба баяцца, бо сёння нарадзіўся нам Збаўца (пар. Лк. 2, 11), які ёсць Бог з намі (пар. Мц. 1, 23) — наша радасць, надзея і збаўленне!

Даваяраючы ўсіх вас апецы Багародзіцы Марыі, якая дала свету Збаўцу Езуса Хрыста, ад усяго сэрца благаслаўляю ў імя Айца, і Сына і Духа Святога. Амэн.

**Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі арцыбіскуп Тадэвуш Кандрусевіч**
**Мінск, 8 снежня 2008 года**

ПАДСУМАВАННЕ

# МЕТАМАРФОЗЫ 2008, НАДЗЕІ 2009...

Вольга ХВОІН

**Наколькі праўду гавораць астролагі, калі апісваюць высакосны год як цяжкі і спрэчны, невядома. Але ўсё ж хочацца, каб 2008 год нарэшце сышоў у гісторыю і саступіў месца новаму 2009-му, свежым спадзевам і — няхай сабе! — нават расчараванням, але новым, без паху зляжаласці і старызны.**



Сёлета Беларусь не зведала такіх бурных падзей, як у 2006-м, але пэўныя метамарфозы адзначыць варта. Змена арыенціраў у знешняй палітыцы, магчыма, стане першым, хаця і не вельмі ўмелым крокам на шляху да свабоднай будучыні краіны. Курс на вонкавую лібералізацыю і Захад, гатоўнасць апошняга да кантактаў і супрацы падаюцца ці не галоўнымі вынікамі года. Новыя тэндэнцыі выявіліся і ў атачэнні кіраўніка дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі: спачатку на гарызонце намаляваўся лорд Бэл — адмысловец у галіне піяру з Туманнага Альбіёну, пасля аднекуль з'явіўся маленькі сын Коля. І Лукашэнка паўстаў перад сваімі выбарцамі клапатлівым бацькам і запраўскім рэфарматарам, якому невядомыя злыя сілы дагэтуль перашкаджалі весці дыялогі з Еўропай. Адным словам, было што людзям абмяркоўваць. У выніку ўзгаданых пераўтварэнняў беларускія турмы пакінулі палітвязні: на волю выйшаў былы кандыдат на пасаду прэзідэнта Аляксандр Казулін, моладзевы актывіст Артур Фінкевіч, прадпрымальнік Сяргей Парсюкевіч і моладзевы актывіст Андрэй Кім (апошнія два, між іншым, сёлета ж у турму і патрапілі). Дзіўныя справы твае, Божа!

Была ў нас сёлета і выбарчая кампанія ў парламент, хаця калі зладзіць апытанне мінакоў на гэтую тэму, то наўрад ці хто адкажа, каго і куды выбіралі. Зрэшты, ужо на другі дзесятак гадоў пераваліла, як выбарчы працэс стаўся няважным і незаўважным. Затое ў нас паболела футбольных заўзятараў: усю восень мы шчыра радаваліся поспехам і перажывалі за няўдачы на еўрапейскай арэне барысаўскага футбольнага клуба «БАТЭ». Пакуль хварэлі за БАТЭ, не заўважылі, як да краіны дакаціўся крызіс. Прыйшла бяда, адкрывай вароты... сваіх грашовых сховішчаў, Расія... Накопленыя за гады ў сховішчах Нацбанку грошыкі хутка пачалі знікаць. Узялі пазыку ў Расіі, і яшчэ хочам. А можа ў наступным годзе Міжнародны валютны фонд падзеліцца з намі сваімі багаццямі — не за так з Захадам размовы размаўляем.

Але што мы ўсё пра высокае ды далёкае, дзе той лорд Бэл і МВФ з крэдытамі? Вось, дзеці праз дарогу ў школу ходзяць, а Мінадукацыі на іх чарговыя рэформы выпрабоўвае. Падручнікаў, гавораць, усім не хапае, відаць, і праўда для ПТВ рыхтуюць навучэнцаў. Блізка і зразумела.

Кіраўнік «Таварыства беларускай школы» **АЛЕСЬ ЛОЗКА** пагаджаецца, што для педагогаў 2008 год быў няпросты: «Я бачу гэты год як вельмі складаны і цяжкі для настаўніцкай грамады. Былі нейкія блуканні, хістанні. Адбыліся змены ў праграмах беларускай мовы і літаратуры, змяняліся праграмы па іншых прадметах, умовы паступлення ў навучальныя ўстановы. Мы перажылі скарачэнне льготаў, згубілі пэўныя катэгорыі педагогаў, прычакалі неабдуманай рэформы... Не менш цяжкім, відаць па ўсім, будзе наступны год. Ізноў варта чакаць скарачэнняў, бо менш дзяцей прыйдзе ў школу, ВНУ пераходзяць на новыя праграмы... Думаю, педагогу трэба будзе больш думаць, як сябе паводзіць у пэўнай сітуацыі. Мы мусім зразумець, што нашае прызванне — і вучыць, і паказваць жыццёвыя шляхі».

Пакуль эканамісты прагназуюць абвалы і крызіс, палітыкі гавораць пра вялікія сацыяльна-палітычныя перамены і новыя шансы для сваёй дзейнасці.

**АЛЯКСАНДР КАЗУЛІН** пад адыходзячым годам рысу падвёў суха: «скончыўся пэўны этап майго жыцця». На наступны год у прагнозах нешматслоўны. Але мае планы працаваць далей, хутка пачнуцца паездкі па Беларусі.

**АЛЕСЬ МІХАЛЕВІЧ**, які сёлета быў выключаны з партыі БНФ, а на апошнім з'ездзе партыі пры абранні старшыні атрымаў палову галасоў партыйцаў, на год 2008, як і на 2009, глядзіць даволі аптымістычна: «Сёлета я ўпершыню адчуў, што многае ў сваёй дзейнасці магу рабіць без сур'ёзнага кантролю ўладаў. Выбарчая кампанія ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі гэта паказала. Калі не браць фальсіфікацыі пры падліку галасоў, то магчымасці для працы з людзьмі былі добрыя. Спадзяюся, што ў наступным годзе ўмовы для нашай дзейнасці не пагоршацца. Гэта будзе час чарнавой працы, вынікі якой праявяцца ў 2010–2011 гадах. Распачынаю кампанію ў абарону супрацоўнікаў такіх сфераў, як адукацыя і медыцына — хацелася б зрабіць усё магчымае, каб палепшыліся ўмовы іх жыцця і працы».

Прадпрымальнік і былы палітвязень **СЯРГЕЙ ПАРСЮКЕВІЧ** таксама лічыць, што ў наступным годзе вялікая верагоднасць сацыяльных пераменаў. «Чытайце класікаў! — раіць маральны аўтарытэт індывідуальных прадпрымальнікаў. — Наспявае сітуацыя незадаволенасці. Калі чалавек жыве сыта, то наўрад ці ён будзе гэтым рызыкаваць дзеля невядомых пераменаў. Іншая справа — у час эканамічнага спаду».

Палітолага **ВІТАЛЯ СІЛІЦКАГА** пытанне пра тое, якім будзе 2009 год, застала акурат на мяжы з Беларуссю: Каляды святкаваць спадар Сіліцкі будзе на Радзіме. «Для мяне гэта вельмі прыватнае свята, час для рэфлексій. На каталіцкае Божае Нараджэнне ў мяне Дзень народзінаў, таму ўся весялосць пачынаецца з гэтага дня», — падзяліўся асабістымі планамі палітолаг. Што тычыцца прагнозаў і ацэнак, то эксперт лічыць сыходзячы год для краіны знакавым, а наступны — важным. «2008 год умоўна падзяліўся на пэўныя перыяды — да перантрусу ў наменклатурнай эліце ў ліпені, да фінансавага крызісу, які закрануў краіну ўвосень, і пасля. Крокі па лібералізацыі няхай сабе былі і вымушаныя, але яны дазваляюць чакаць, што на ўсё гэта будзе пэўная рэакцыя, — перакананы Віталь Сіліцкі. — Тым больш, падзеі развіваюцца пад знакам эканамічных цяжкасцяў. Улада зразумела, што існаваць у старых межах немагчыма, і пачала выпрацоўваць новую схему выжывання. З'явілася новая знешняя палітыка, арыентаваная не толькі на Расію. Праўда, з гэтай схемы пакуль выпадае народ і апазіцыя. Лібералізацыя пайшла, і гэта сталася пэўным выпрабаваннем для апазіцыйных сілаў. Цягам стольких год апазіцыя была раскіданая, цяпер яна перажывае ўнутраны крызіс. Калі хочаце, то гэта можна параўнаць з сітуацыяй, калі з чалавека нечакана знялі кайданы і загадалі бегчы стометроўку. А ён ужо не можа. Адсюль падсвядомае жаданне начапіць гэтыя кайданы назад. Для палітыкаў апазіцыі лібералізацыя звязаная і з крызісам ідэнтычнасці, да таго ж стольки год існавала манаполія на стасункі з Заходняй цывілізацыяй, якую раптоўна парушылі».

Тыдзень перадыху на навагоднія святы нам з вамі, спадарства. А далей — з крызісам змагацца, працы трымацца, дыялогі весці, грошы шукаць ці зарабляць. Да ўсяго, менш за паўгода ў кіраўніцтва Беларусі засталося, каб паказаць Еўропе сябе з лепшага боку, даказаць, што на шлях выпраўлення сталі, інакш плакалі перамовы і крэдыты, а з імі і нашы з вамі правы і свабоды.

Астролагі абяцаюць у 2009-м шмат цяжкай, упартай працы ды роздумаў. То працуйма. Бо, як гаворыцца, дарогу адужае той, хто ідзе. Але перш чым зрабіць крок, не забывайцеся падумаць. Шчаслівага Вам новага году!

ПРАБЛЕМА

# ЭНЕРГЕТЫКА ГРОДЗЕНШЧЫНЫ

Язэп ПАЛУБЯТКА

**18 снежня першы віцэ-прэм'ер ураду Уладзімір Сямашка ў выступе на пасяджэнні Нацсавета па працоўных і сацыяльных пытаннях паведаміў, што пляцоўка пад будучае будаўніцтва АЭС выбрана. Ёй стала Астравецкая. І ўжо 21 студзеня 2009 года было аб'яўлена аб пачатку будаўніцтва першых чатырох 9-павярховых дамоў для будаўнікоў, якія роўна праз год пачнуць працу над прамысловай пляцоўкай.**

## Астравецкая АЭС

Паколькі АЭС запатрабуе вялікую колькасць вады, то пляцоўка абрана непадалёку ад ракі Вілія ля вёскі Газы. Месца роўнае. Да вайны тут быў вайсковы аэрадром.

Спецыялісты і мясцовыя актывісты з грамадскага камітэта «Астравецкая атамная — гэта злачынства» лічаць, што калі пачнуць забіраць з ракі ваду, ніжэй па цячэнні янаператворыцца ў звычайную канаву. Занепакоены яны яшчэ і тым, што самая экалагічна чыстая Нарачанская запаветная зона перастане быць такой. Таму і пачалі збор подпісаў пад зваротам не дапусціць пабудовы АЭС у гэтым рэгіёне. Неўзабаве зварот будзе накіраваны прэзідэнту і ў вышэйшыя дзяржаўныя інстанцыі. Аднак кіраўніцтвам краіны выбар зроблены, і значная частка насельніцтва раёна, якую больш турбуе не экалогія ды будучае нашчадкаў, а хлеб надзённы, падтрымлівае гэтую ідэю. Падтрымлівае, таму што на перыяд пабудовы АЭС тут будзе створана пяць тысяч працоўных месцаў. Але ці дастануцца яны мясцовым жыхарам? Ёсць інфармацыя, што існуе неафіцыйнае рашэнне ўладаў мясцовых жыхароў на пабудовы АЭС не прымаць, бо калгасы пазбавяцца рабочай сілы.

Мясцовыя ўлады працягваюць чыніць перашкоды праціўнікам пабудовы станцыі. 18 снежня Астравецкі суд павінен быў разгледзець скаргу актывіста АГП Івана Крука да райвыканкаму, што вынес рашэнне пра забарону пікетаў супраць пабудовы АЭС. Суд перанесены. Тым не менш актывісты маюць намер працягваць супрацьў.

Прапагандысцкая кампанія ў падтрымку пабудовы АЭС у Астравецкім раёне зацьміла праблемы, звязаныя з узвядзеннем іншых аб'ектаў энергетыкі ў гэтым рэгіёне, такіх, як ГЭС на Нёмане ля Гродна, цеплаэлектрастанцыя на вугалі ў Зэльве і ветраная — ля Навагрудка.

## ГЭС на Нёмане

Рашэнне аб будаўніцтве ГЭС ля Гродна было прынята яшчэ ў 2003 годзе на ўзроўні Савета міністраў. Фактычна ніхто не аспрэчвае неабходнасць пабудовы падобнай станцыі, але на працягу пяці гадоў ні разу не адбылося публічнага абмеркавання праблемы. «Гроднаэнерга» не пагадзілася на правядзенне «круглага стала» з запрашэннем спецыялістаў і прэсы. У гэтай справе гродзенскі навуковец прафесар Алесь Астроўскі называе галоўнай праблемай адсутнасць галоснасці. Уладзімір Шатэрнік, кіраўнік «Гроднаэнерга», кажа: «Увод ГЭС дазволіць атрымліваць танную экалагічна чыстую энергію, забяспечыць ёй усё насельніцтва Гродна, а па берагах вадасховішча, даўжыня якога 50 кіламетраў, будуць размешчаны месцы адпачынку, спартыўныя базы, дачныя пасёлкі, у самым вадасховішчы развядзецца шмат рыбы».



Аднак наконт такіх меркаванняў існуюць іншыя думкі. Эколаг Ніна Палуцкая лічыць, што станцыя кампенсуе толькі 5–7 працэнтаў энергіі, што неабходна вобласці, але пры гэтым будзе затоплена значная колькасць пойменных земляў, вёскі, а ніжэй плаціны Нёман абмялее.

Занепакоеная таксама камунальнікі, бо па дну ракі ідзе шмат каналізацыйных камунікацый. У выпадку змяншэння ўзроўню вады іх неабходна паглыбляць, гэтак жа, як і апоры мастоў.

Праблемамі, што паўстануць пасля пабудовы станцыі, занепакоены і вучоны Ленінградскага дзяржаўнага гідралагічнага інстытута Віктар Каталікаў, які некалькі гадоў таму даследаваў раку і лічыць, што «ГЭС перахопіць донныя наносы, і гэта ў большай ступені адаб'ецца ў Літве, дзе хуткасць плыні запавольваецца».

Акрамя таго, як паказвае практыка, вадасховішчы маюць такія недахопы, як заглейванне, накапленне шкодных адходаў, змену разнастайнасці рыбаў і планктону не ў лепшы бок.

Дзве суседнія краіны Беларусь і Літва маюць дыяметральна супрацьлеглыя падыходы да пытання будаўніцтва ГЭС на Нёмане. У Беларусі ідзе будаўніцтва, а ўрад Літвы прыняў пастанову, якая забараняе ўзводзіць плаціны на рацэ.

Да праціўнікаў пабудовы гродзенскай ГЭС нядаўна далучыліся прадстаўнікі тутэйшага маладзевага руху «Разам».

## КЭС у Зэльве

Станцыя ў Зэльве мае назву КЭС — кандэнсацыйная электрастанцыя на вугалі. Магутнасць яе будзе складаць 660 Мват. Будаўніцтва пакуль не распачалося, але пляцоўка абрана непадалёку ад горада і вадасховішча — зоны адпачынку гараджан.

Выбар месца пабудовы звязаны з транспартнымі шляхамі пастаўкі вугалю. Пакуль яшчэ не вырашана пытанне краіны-пастаўшчыка. Вывучаюцца тры варыянты: Польшча, Украіна і Краснаярскі край (Расія). Вугаль у Польшчы больш якасны, але дарагі. Расійскі таннейшы, ды яго трэба весці праз усю федэрацыю. Кіраўніцтва «Гроднаэнерга» сцвярджае, што ўплыў на экалагічную прастору зведзены да мінімуму, тут збіраюцца ўстанавіць вельмі дарагія фільтры. Першы энергаблок плануецца ўвесці ў эксплуатацыю ў 2014 годзе.

## Ветракі ля Навагрудка

Першы ў Беларусі вятрак будзе пастаўлены на ўзвышшы ў населеным пункце Грэбнікі пад Навагрудкам. Ужо ёсць архітэктурны праект. Падобную станцыю мяркуецца ўвесці ўжо ў наступным годзе.

Але адзін з вядучых спецыялістаў «Гроднаэнерга» лічыць: «Вятрак на Наваградчыне — дзяржаўныя грошы на вецер. Паколькі Беларусь не мае сваёй вытворчасці па выпуску падобных установак, як і спецыялістаў па іх установцы, наладцы, абслугоўванню, то гэта ўсё будзе замежнае. Вятрак будзе магутнасцю ў 1,5 Мват. Кошт яго — 6 мільярдаў беларускіх рублёў. Апарат збіраюцца набываць у Германіі. Дадайце сюды транспартныя і накладныя выдаткі, плюс камандзіровачныя спецыялістам і аплату іх навучання за мяжой. Нават наш эканаміст канчатковай лічбы гэтага праекту не ведае. Некаторыя спецы з АН РБ знайшлі высотныя кропкі на Беларусі (смешна!), дзе вецер 5–7 метраў у секунду. Нават калі беларуская гара ў 300 метраў, то мачта ветрака не болей 80-ці. Для нашай тэрыторыі, дзе вятры ад Атлантыкі губляюць свой шал, тая вышыня не паказчык. Ці зможа ў марознае надвор'е або спякоту, або восеньскі туман дзьмуць падобны вецер на такой вышыні ды яшчэ круціць лопасць у 40 метраў? Чыстай вады пражэкт, хоць я і за развіццё ўласнай энергетыкі».

АЗДАРАЎЛЕННЕ

# Генадзь Грушавы: УКАЗ ПРЭЗІДЭНТА № 688 НЕ ВЫРАШАЕ ПРАБЛЕМУ

**Аляксандр Лукашэнка 19 снежня падпісаў Указ № 688 «Аб прыпыненні дзеяння Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 13 кастрычніка 2008 года № 555». Як паведамляе БелТА, гэты дакумент на час калядных і навагодніх вакацый (з 20 снежня 2008 года да 20 студзеня 2009 года) прыпыняе абмежаванні па выездзе беларускіх дзяцей на аздараўленне ў замежныя дзяржавы, з якімі да цяперашняга часу не заключаны міжнародныя пагадненні. Гэтыя абмежаванні былі ўведзены згаданым вышэй Указам № 555.**



Старшыня Беларускага дабрачыннага фонду «Дзецям Чарнобыля» прафесар Генадзь Грушавы скептычна ставіцца да гэтага рашэння кіраўніка беларускай дзяржавы, пра што і распавёў у размове з карэспандэнтам «НЧ» Генадзем Кеснерам.

— Еўрапейская дыпламатыя, еўрапейскія кіраўнікі звярнуліся да Аляксандра Лукашэнкі з прапановай, калі не сказаць з патрабаваннем, накласці мараторый на дзеянне 555-га ўказа. Гэта было даволі жорсткае патрабаванне, і звязана яно было з тым, што Еўропа прапанавала: пакуль вядуцца перамовы па заключэнню прымальнага для абодвух бакоў — Беларусі і Еўропы — варыянта дамовы па аздараўленню дзяцей, да таго часу дзеці павінны атрымаць магчымасць свабодна працягваць ездзіць па запрашэннях на аздараўленне за мяжу. Вось якая была пазіцыя Еўропы — вельмі рацыянальная, разумная і гуманітарная, арыентаваная ў першую чаргу на інтарэсы беларускіх дзяцей.

Чым адказвае беларускі прэзідэнт? Ён па сутнасці поўнасцю ігнаруе гэту прапанову, а знешне, фармальна ён робіць выгляд, што быццам бы пагадзіўся з ёй.

Еўропа прапанавала мараторый да моманту падпісання такога пагаднення, і тэрмін не агаворваўся: гэта можа быць месяц, могуць быць два тыдні, можа быць паўгода — гаворка ішла пра тое, што да таго часу, пакуль не будзе выпрацаваны прымальны варыянт, дзеці працягваюць свабодна ездзіць на аздараўленне.

А кіраўнік дзяржавы да 20 студзеня (а паглядзіце на каляндар, Лукашэнка фактычна толькі 19 снежня падпісаў указ) дае дазвол на паездкі дзяцей. Папершае, для таго, каб аформіць дзіцячую групу для паездкі за мяжу, толькі ў Мінску патрабуецца сама мала два тыдні. Таму што трэба спачатку атрымаць дазвол у Дэпартаменце па гуманітарнай дапамозе, трэба атрымаць візу ў Міністэрстве адукацыі і затым трэба атрымаць візу ў амбасадзе той краіны, куды выязджаюць дзеці. На гэта звычайна патрабуецца два тыдні, часам нават больш. Значыць, той тэрмін, які выдзелены зараз як мараторый, калі дазваляюцца паездкі дзяцей, дастаткова, каб паспаць дзіця на адпачынак за мяжу ў лепшым выпадку на 10–12 дзён, і зрабіць гэта можна будзе дзе-небудзь 5–10 студзеня.

Улічваючы, што зараз па ўсёй Еўропе калядныя і навагоднія святы, што большасць амбасад будзе працаваць у гэты час дастаткова абмежаваны час, можна казаць аб непрыхаваным фарысействе. І мне падаецца, што гэта класічны спосаб паводзінаў нашага прэзідэнта, калі ён, не маючы магчымасці адрынуць даволі разумныя і кампрамісныя рашэнні Еўропы, прапануе варыянт, які нічога па сутнасці не вырашае, а фактычна толькі стварае ілюзію яго гатоўнасці ісці на перамовы.

Такім чынам, па-першае, мараторый павінен не мець тэрміну дзеяння альбо мусіць быць не меншы за паўгода, каб можна было рэальна правесці ўсю працу па заключэнню дамоваў, і па-другое, гэтыя паўгода можна было б нармальна накіроўваць дзяцей на аздараўленне за мяжу. Нічога такога не адбылося, таму я лічу, што гэта чыста касметычны ход, і вельмі спадзяюся, што еўрапейскія палітыкі, еўрапейскія кіраўнікі адэкватна адрэагуюць на рашэнне беларускага прэзідэнта.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 29 СНЕЖНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

### 1

**05.30** Дакументальна-пазнавальны серыял «Таямнічы свет жывёл» (Францыя).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.30** У свеце матораў.
**09.05, 14.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Nota Bene.
**09.35** Здароўе.
**10.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «Позняе каханне».
**11.00** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**12.10** Дак. фільм. Невядомая версія» (Расія).
**13.05** Камедыя «Беражыся аўтамабіля».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Культурныя людзі.
**16.00** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**16.50** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.45** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 01.00** Зона Х. Крымінальная хроніка.
**19.35** Арэна. Праграма аб спорце.
**19.55** Ток-шоў «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.50** Навагодні тыдзень на Першым. Сольны канцэрт групы «Новы Іерусалім».
**23.05** Крымінальная камедыя «Два крутых хлопцы» (Іспанія).
**01.05** Дзень спорту.
**01.15** «Будні чэмпіёнаў».
**01.45** Усе стыхіі.

### Н

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.00, 01.20** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Шчаўкунок: прынц арэхаў».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00, 23.15, 01.35** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.50** «Малахаў+».
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**15.00** «Зорная радня».
**16.15** Прэм'ера АНТ: Рэаліці-шоў «Пасаг для нявесты». Фінал.
**17.45** «Жарт за жартам».
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**21.05** «Песня года Беларусі-2008».Ч. 1.
**23.20** Фільм «Снежны анёл». Расія, 2007.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень».
**09.30** «Вялікі сняданак».
**10.05** «Дарагая перадача».
**10.40** «Наша справа».
**10.50** Фільм «Казкі старога чараўніка». СССР.
**13.10** «Далёкія сваякі».
**13.50** «Мая хата».
**14.20** «Горад дзяцінства».
**14.35** «Крутыя рабяты». Народнае шоў.
**16.00** «Культурнае жыццё».
**16.50** «Спартовы тыдзень».
**17.20** «Мінdriшчына».
**17.30** Фільм «Імяніны». Расія, 2004 г.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «Добры вечар, маляня».
**20.30** Прэм'ера! «Снягурка для дарослага сына». Расія, 2007 г.
**22.55** «Салдаты. Новы год, тваю дывізію».
**00.30** «Закон і крымінал».
**00.35** «Сталічны футбол».
**01.05** «Ледаколы». Канцэрт групы «J-МОРС».

### ЛАД

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.25** Тэлебарометр.
**08.45** Усё аб бяспецы.
**09.10** У гэты дзень.
**09.15** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**10.00** Фільм «Сахара» (ЗША-Іспанія).
**12.15** Слова пісьменніка.
**12.45** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**13.35** Бухта капітанаў.
**14.15** Кінасачасопіс «Жадаю ўсё ведаць».
**15.05** Пазакласная гадзіна.
**15.20** Гіпноз.
**16.10** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.30** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-1».
**21.10** Калыханка.
**21.35** Музычная рэтра-камедыя «Мы з джазу» (СССР).
**23.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**00.20** Хакей. Формула гульні.

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.15** Фільм «Замры, памры, уваскрэсься».
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.20** Серыял «Расійская імперыя. Пачатак». Фільм 3. «Павел».2 серыя.
**12.30** Дэтэктыў «Тэрыторыя». 1-я серыя.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.20** «Савецкая імперыя. Братэрская ГЭС». Дакументальны фільм.
**15.15** «Кулагін і партнёры».
**15.50** Суд ідзе.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.25** «Падарожжы музыкі».
**17.55** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.35** Тэлесерыял «Райскія яблычкі».
**21.35** Фільм «Хто прыходзіць у зімовы вечар...». 2006 г.
**23.30** «Кулагін і партнёры».
**00.00** Навіны - Беларусь.
**00.10** «Весткі+».

### НТВ

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.45** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**09.05** «Сёння. Выніковая праграма».
**10.25** «Кулінарны паядынак».
**11.15** «Кватэрнае пытанне».
**12.10** «Следства вялі...».
**13.30** Вострасюжэтны фільм «Шпіёнскія гульні: прыватны візіт».
**15.05** «Рускія не здаюцца!».
**15.30** «Агляд.Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.45** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**21.55** «І зноў добры дзень!».
**23.35** «Ты смешны!». Усерасійскі конкурс народных гумарыстаў.
**00.25** Містычны серыял «Медыум».
**01.10** «Школа зласлоўя».

### EUROSPORT

**09.30** Вось дык так!!!
**10.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Германіі. Мужчыны. 15 км вольным стылем.
**11.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. Кваліфікацыя. HS 213 (Германія).
**12.30** Лыжнае двааборства. Кубак свету ў Германіі. 15 км па сістэме Гундэрсена.
**13.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Германіі. Мужчыны. 15 км вольным стылем.
**14.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі. Кваліфікацыя. HS 213.
**15.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Чэхіі (Прага). Мужчыны і жанчыны. Спрынт вольным стылем. Прамая трансляцыя.
**17.15** Футбол. Класіка Кубка ЎЕФА. «Ліверпуль» (Англія) - «Алавес» (Іспанія). Сезон 2000-2001 гг.
**18.15** Футбол. Класіка Кубка ЎЕФА. «Фейноорд» (Нідэрланды) - «Дортмунд» (Германія). Сезон 2001-2002 гг.
**19.15** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі. Жанчыны. Слалам. 1-я спроба.
**19.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі. Жанчыны. Слалам. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**20.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Оберстдорф). HS 137.
**22.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Да-1. Сусветны Гран-пры. Фінал (Японія).
**01.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Оберстдорф). HS 137.

---

**04.55** Афіша.
**05.00, 06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 00.00, 01.00** Навіны Садружнасці.
**05.05, 06.05, 07.05, 01.05, 02.30** Садружнасць live .
**05.30** Праграма «Жаночы часопіс».
**06.35** Тэлемагазін «Удалая купля».
**06.45** Праграма «Цік-так».
**07.30** Праграма «Агульны інтэрас».
**08.05** Дак. серыял «Падводная адысея каманды Кусто». 153, 154 серыя.
**09.05** Праграма «Разам».
**10.05** Худы. фільм «Плачу наперад».
**12.05** Дзень таджыкскага кіно. Маст. фільм «Хто паедзе ў Трускавец».
**14.05** Мультсерыял «Двайняты Крамп».
**14.30** Маст.серыял «Робін з Шэрвуда».
**15.20** Дак. серыял «Купаючыся ў раскошы».
**15.55** Праграма «Квіток на сёння».
**16.05** Праграма «Гадзіна суду. Справы сямейныя».
**17.05** Тэлесерыял «Каханне як каханне».
**18.20** Праграма Акцэнты .
**18.30** Тэлесерыял «Па матывах аповядаў Шукшына».
**19.30** Праграма «Агульны інтэрас».
**20.05** Ток-шоў «Слова за слова».
**21.20** Праграма «Дакументальны дэтэктыў. Раніцай загіне горад».
**22.30** Дак. фільм «Кома гэта праўда».
**23.20** Дзень таджыкскага кіно. Маст. фільм «Хто паедзе ў Трускавец».
**01.30** Дак. серыял «Падводная адысея каманды Кусто».
**03.00** Праграма «Дакументальны дэтэктыў. Раніцай загіне горад».
**04.00** Праграма «Гадзіна суду. Справы сямейныя».

## 30 СНЕЖНЯ, АЎТОРАК

### 1

**05.10** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-3» (Расія).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** Арэна. Праграма аб спорце.
**09.05, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.10** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**11.00** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**12.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**13.05** Тэлесерыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-3» (ЗША).
**14.05** Ток-шоў «Ход у адказ».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Карэлічскія апавяданні» цыклу «Зямля беларуская».
**15.40** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-3» (Расія).
**16.45** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.45** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 00.55** Зона Х. Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50** Навагодні тыдзень на Першым. Сольны канцэрт А.Шаркуновай.
**23.05** Трылер «Спрытныя рукі» (ЗША).
**01.00** Дзень спорту.

### Н

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00, 20.30, 23.05, 01.45** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Чакай мяне.
**10.00** «Шчаслівы Эльф».
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў+».
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**15.00** «Іронія лёсу Барбары Брыльскай».
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Камедыя «Гусарская балада».
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**18.55** Прэм'ера. «Рудая». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Песня года Беларусі-2008».Частка 2.
**23.20** Навіны спорту.
**23.25** «Зваротны адлік». «Маніфест Жылуновіча».
**00.00** Камедыя Эльдара Разанава «Гараж».
**02.00** Навіны спорту.

### СТВ

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Закон і крымінал».
**06.25** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.25** Фільм «Снягурка для дарослага сына». Расія, 2007 г.
**09.55** «Прыватныя гісторыі»: «Жахі і радасці Новага года».
**10.40** «Новыя падарожжы дылетанта».
**11.10** Фільм-казка «Пітэр Пэн». 1987 г.
**13.50** «Дарагая перадача».
**14.00** Фільм «Дон Сезар дэ Базан». СССР.
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Далёкія сваякі».
**17.50** Фільм «Мая мама Снягурка». Расія.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «Аўтапанарама».
**20.30** Камедыя «Скарб». Расія, 2007 г.
**22.00** «Рэпарцёр СТБ».
**23.00** Адкрыты чэмпіянат Рэспублікі Беларусь па велаcіпедным спорце на трэку 2008.
**23.30** «Салдаты. Добры дзень, рота, Новы год!».
**01.05** «Закон і крымінал».
**01.10** СТБ прадстаўляе: «Кіназдымкі». Канцэрт групы «Безбілета».

### ЛАД

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** У гэты дзень.
**08.25** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-1» (Расія).
**10.15** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**12.00** Хакей. Формула гульні.
**12.30** Музычная рэтра-камедыя «Мы з джазу» (СССР).
**14.00** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**14.50** Мультфільм.
**15.00** Пазакласная гадзіна.
**15.15** Бітва экстрасэнсаў.
**16.05** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**16.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.30** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-1» (Расія).
**20.00** Беларуская часіна.
**21.00** Калыханка.
**21.25** «Цудоўная сямёрка». Усе сезоны.
**22.25** Спорт-кадр.
**22.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск) - Поўначсталь (Чарапавец).

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.10** Тэлесерыял «Райскія яблычкі».
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.25** Пакой смеху.
**12.30** Дэтэктыў «Тэрыторыя». 2-я серыя.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.20** «Жыццё насуперак. М.Таніч». Дакументальны фільм.
**15.15** «Кулагін і партнёры».
**15.50** Суд ідзе.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.25** «Прафесія: смяхач». У.Пенкін.
**17.55** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.35** Тэлесерыял «Райскія яблычкі».
**22.35** Прэм'ера. «Як запальвалі «Агеньчык». Сакрэты навагодняга эфіру».
**23.30** «Кулагін і партнёры».
**00.00** Навіны - Беларусь.
**00.10** «Весткі+».

### НТВ

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**09.00** «І зноў добры дзень!».
**10.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.50** «Quattroruote».
**11.20** Фантастычны фільм «Пяцёра дзяцей і чараўніцтва».
**13.30** Вострасюжэтны фільм «Шпіёнскія гульні: уцёкі».
**15.10** «Вар'яцкі дзень. Агляд».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**18.25** «Агляд.Надзвычайнае здарэнне».
**19.45** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**21.55** «Следства вялі...».
**23.35** «Ты смешны!». Усерасійскі конкурс народных гумарыстаў.
**00.25** Містычны серыял «Медыум».
**01.10** Маладзевая камедыя «Ажанюся на першай сустрэчнай».

### EUROSPORT

**09.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Чэхіі (Прага). Мужчыны і жанчыны. Спрынт вольным стылем.
**10.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Оберстдорф). HS 137.
**12.00, 14.00, 14.30, 15.00, 15.30, 20.00, 20.30** Вось дык так!!!
**13.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Чэхіі. Мужчыны і жанчыны. Спрынт вольным стылем.
**16.00** «Вось дык так!!!» Алімпійскі выпуск.
**16.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Оберстдорф). HS 137.
**18.00** Футбол. Класіка Кубка ЎЕФА. «Фейноорд» (Нідэрланды) - «Дортмунд» (Германія). Сезон 2001-2002 гг.
**19.00** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА. «Сэлцік» (Шатландыя) - «Порто» (Партугалія). Сезон 2002-2003 гг.
**21.00** Фігурнае катанне. Паказальныя выступы (Германія). Прамая трансляцыя.
**23.00** Спартовыя бальныя танцы. Кубак Крамля (Масква, Расія).
**00.00** Ралі. Ралі рэйд. Дакар.
**00.30** Супербайк. Чэмпіянат свету. Агляд.
**01.30** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету 2010 (ПАР). Агляд 2008 г.

---

**04.55** Афіша.
**05.00, 06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 10.00, 11.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 20.00, 21.00, 22.00, 23.00, 00.00, 01.00** Навіны Садружнасці.
**05.05, 06.05, 07.05, 01.05, 02.30** Садружнасць live.
**05.30** Дак. серыял «Купаючыся ў раскошы».
**06.35** Тэлемагазін «Удалая купля».
**06.45** Праграма «Цік-так».
**07.30** Праграма «Каму на Русі жыць добра...».
**08.05** Дак. серыял «Падводная адысея каманды Кусто».
**09.05** Ток-шоў «Слова за слова».
**10.05** Тэлесерыял «Сям'я Серано».
**11.05** Тэлесерыял «Па матывах аповядаў Шукшына».
**12.05** Здабытак рэспублікі. Дзень таджыкскага кіно. Маст. фільм «Белы раяль».
**14.05** Мультсерыял «Двайняты Крамп».
**14.30** Маст. серыял «Робін з Шэрвуда».
**15.20** Дак. серыял «Купаючыся ў раскошы».
**15.55** Праграма «Квіток на сёння».
**16.05** Праграма «Гадзіна суду. Справы сямейныя».
**17.05** Тэлесерыял «Каханне як каханне».
**18.20** Праграма Акцэнты .
**18.30** Тэлесерыял «Па матывах аповядаў Шукшына».
**19.30** Праграма «Каму на Русі жыць добра...».
**20.05** Ток-шоў «Слова за слова».
**21.20** Праграма «Дакументальны дэтэктыў. Чарнаморскія піраты ХХ стагоддзя».
**22.30** Дак. фільм «Кома гэта праўда».
**23.20** Здабытак рэспублікі. Дзень таджыкскага кіно. Маст. фільм «Белы раяль».
**01.30** Дак. серыял «Падводная адысея каманды Кусто».
**03.00** Праграма «Дакументальны дэтэктыў. Чарнаморскія піраты ХХ стагоддзя».
**04.00** Праграма «Гадзіна суду. Справы сямейныя».

## 2 СТУДЗЕНЯ, ПЯТНІЦА

---

**06.30** «Калядныя песні Мапетаў». Музычная камедыя (ЗША).
**07.50** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**08.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.10** Анімацыйная казка «Карлік Нос» (Расія).
**10.25** Фантастычная камедыя «Мой каханы марсіянін» (ЗША).
**12.15** «Мінскі бенефіс Кіма Брэйтбурга». Канцэрт. 1-я частка.
**13.00** Прэм'ера. Анімацыйная камедыя «Тачкі» (ЗША).
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Мары спраўджваюцца». Фільм «Мінск - Вена». Частка 2-я.
**15.50** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «Мае ўспаміны пра Новы год».
**16.45** Прэм'ера. Фільм-фэнтэзі «Гары Потэр і філасофскі камень» (Вялікабрытанія).
**19.15** Меладраматычны серыял «І падае снег...» (Расія). 3-я і 4-я серыі.
**21.00** Панарама.
**21.35** Навагодні тыдзень на Першым. Сольны канцэрт групы «Лепрыконсы».
**22.45** Баявік «Без асобы» (ЗША).
**01.05** Эксцэнтрычная камедыя «Вячэра з прыдуркам» (Францыя).

---

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Музычны фільм «Нябесныя ластаўкі».
**11.15** Ералаш.
**11.50** Камедыя «Дзяўчаты».
**13.25** «Навагодняя гумарыстычная дыскатэка».
**14.05** Камедыя «Аперацыя «З Новым годам!».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** «Новыя песні аб галоўным». Навагодні канцэрт.
**20.30** Нашы навіны.
**20.55** «Клуб вясёлых і знаходлівых». Вышэйшая ліга. Фінал.
**23.10** Камедыя «Француз».

---

**07.05** Мультыплікацыйны калейдаскоп.
**08.15** Фільм-казка «Прыгоды Бураціна». Беларусьфільм, 1975 г.
**10.30** Фільм «Кальe для снежнай бабы». Украіна, 2007 г.
**12.00** Фільм «Таксі». Францыя, 1998 г.
**13.30** Фільм «Таксі-2». Францыя, 2000 г.
**15.00** Фільм «Таксі-3». Францыя, 2003 г.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** Фільм «Таксі 4». Францыя, 2007 г.
**18.10** «Калі смешна, тады не страшна». Канцэрт М.Задорнава.
**19.30** «24 гадзіны».
**19.55** Камедыя «Сенсацыя». ЗША, 2006 г.
**21.40** ПРЭМ'ЕРА! Фільм «Шукаю нявесту без пасагу». Расія, 2003 г.
**23.25** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.05** СТБ прадстаўляе: «Новы год наадварот».
**01.50** «Новы год з «Мурзілкі International».

---

**07.55** Ранішняя падзарадка.
**08.55** Прыгодніцкі серыял «Тры талеры» («Белтэлерадыёкампанія» - «Беларусьфільм»). 3-я і 4-я серыі.
**10.40** Анімацыйны блокбастар «Ілья Мурамец і Салавей Разбойнік» (Расія).
**12.05** Усё аб бяспецы.
**12.35** Творчы вечар І. Дземарына. Частка 2-я.
**13.45** Прэм'ера. Мюзікл «Рамэа і Джульета» (Францыя).
**16.25** «Цудоўная сямёрка». Фінал года.
**19.40** Героіка-прыгодніцкі анімацыйны фільм «Дабрыня Нікіціч і Змей Гарыныч» (Расія).
**20.55** Народная камедыя «Асаблівасці нацыянальнай рыбалкі» (Расія).
**22.50** Камедыйная меладрама «Анатомія Грэй» (ЗША).
**01.00** Хакей. НХЛ. Агляд тыдня.

### РОССИЯ

**07.00** Фільм «Жадаю табе сказаць». 1985 г.
**07.35** Фільм «Кажан». 1979 г.
**09.55** Камедыя «Тры дні ў Маскве». 1974 г.
**12.20** Камедыя «Віртуальны раман». 2005 г.
**14.00** Весткі.
**14.10** Фільм «Шчасце маё». 2007 г.
**16.00** Прэм'ера. «Песня года». Частка першая.
**19.00** Прэм'ера. «Песня года». Частка другая.
**22.00** Прэм'ера-2009. Фільм «Камедыя памылак». 1978 г.
**02.10** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.35** Дэтэктыў «Тонкая штучка».
**08.00** Сёння.
**08.15** Школьная прыгодніцкая камедыя «Патапаў, да дошкі!».
**10.00** Сёння.
**10.20** Камедыя становішчаў «Інспектар-Разявячы».
**12.05** Мультфільм.
**13.00** Сёння.
**13.25** Камедыя «Чатыры таксісты і сабака».
**15.25** «Жаночы погляд». Музычна-астралагічны прагноз на 2009 год.
**16.00** Сёння.
**16.25** Дэтэктыўны Серыял «Вяртанне Мухтара».
**17.15** Навагодняя камедыя «Кахай мяне».
**19.00** Сёння.
**19.30** Вестэрн «Вадаспад анёла».
**21.40** Псіхалагічная драма «Ілжывая спакуса».
**00.05** «Аляксандр Новікаў. Юбілейны канцэрт».

### EUROSPORT

**09.30** Ралі. Ралі рэйд. Дакар.
**10.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Чэхіі (Нове Места). Мужчыны і жанчыны. Спрынт вольным стылем.
**11.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). HS 140.
**12.45** Хакей. Кубак Шпэнглера ў Швейцарыі (Давос). Фінал.
**14.15** Аўтаспорт. Кубак Нацый. Гонка Чэмпіёнаў (Лондан, Вялікабрытанія).
**15.15** Аўтаспорт. Гонка Чэмпіёнаў (Лондан, Вялікабрытанія).
**16.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). HS 140.
**18.00** Футбол. Класіка Кубка ЎЕФА. «Эспаньол» (Барселона, Іспанія) - «Севілля» (Іспанія). Сезон 2006-2007 гг.
**19.00** Футбол. Класіка Кубка ЎЕФА. «Зеніт» (Санкт-Пецярбург, Расія) - «Глазга Рэйнджэрс» (Шатландыя). Сезон 2007-2008 гг.
**20.00** Футбол. Класіка Кубка ЎЕФА. «Сэлцік» (Шатландыя) - «Порто» (Партугалія). Сезон 2002-2003 гг.
**21.00** Акрабатычная гімнастыка. Чэмпіянат свету ў Шатландыі (Глазга).
**22.00** Цімберспорт. Чэмпіянат Еўропы ў Аўстрыі.
**22.30** Цімберспорт. Чэмпіянат Еўропы ў Аўстрыі.
**23.00** Самыя моцныя людзі планеты. Гран-пры суперсерый ў Швецыі.
**00.00** Ралі. Ралі рэйд. Дакар. 0-ы этап.
**00.30** Экстрэмальныя віды спорту.
**01.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). HS 140.
**02.00** Ралі. Ралі рэйд. Дакар. 0-ы этап.

---

**04.55** Афіша.
**05.00** Праграма «Вёска дурняў» серыя 3.
**05.30** Чарадзейныя казкі. Мультфільм «Прыгажуня і пачвара».
**06.30** Маст.серыял «Робін з Шэрвуда» 35 серыя.
**07.00** Здабытак рэспублікі. Дзень узбекскага кіно. Вакацыі Маст. фільм Прыгоды Алі-Бабы і сарака разбойнікаў» 1 серыя.
**08.25** Дак. серыял «Падводная адысея каманды Кусто» 157 серыя.
**09.00** Ток-шоў «Слова за слова». Паўтор ад 1 студзеня.
**10.00** Тэлесерыял «Па матывах аповядаў Шукшына» 4 серыя. Паўтор ад 1 студзеня.
**11.00** Праграма «Вёска дурняў» серыя 15.
**11.30** Казкі нашага дзяцінства. Маст. фільм «Чарадзейная лямпа Аладзіна».
**13.30** Чарадзейныя казкі. Мультфільм «Прыгажуня і пачвара». Паўтор ад 06.30.
**14.30** Маст.серыял «Робін з Шэрвуда» 35 серыя.
**15.00** Навіны Садружнасці.
**15.20** Праграма «Вёска дурняў» Серыя 3. Паўтор ад 06.00.
**15.55** Праграма «Квіток на сёння».
**16.00** Маст. фільм «Рататуй».
**18.00** Навіны Садружнасці.
**18.20** Навіны Садружнасці. Культура.
**18.30** Тэлесерыял «Па матывах аповядаў Шукшына» 5 серыя.
**19.30** Ток-шоў «Слова за слова».
**20.30** Маст. фільм «Шакалад».
**22.30** Казкі нашага дзяцінства. Маст. фільм «Чарадзейная лямпа Аладзіна». Паўтор ад 12.30.
**00.30** Праграма «Вёска дурняў» Серыя 15. Паўтор ад 12.00.
**01.00** Маст. фільм «Рататуй». Паўтор ад 17.00.
**03.00** Маст. фільм «Шакалад». Паўтор ад 21.30.

## 3 СТУДЗЕНЯ, СУБОТА

---

**06.30** Моладзевы серыял «Сэрца акіяну» (Францыя).
**06.55** Брытва Окама.
**07.25** Існасць.
**07.50** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**08.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.00** Навіны.
**09.05** Здароўе.
**09.40** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**10.15** Шпілька.
**10.50** Ранішняя хваля.
**11.25** «Марскі дазор». Відэафільм АТН.
**11.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**12.00** Навіны.
**12.10** Дакументальны фільм «Масфільм». Невядомая версія» (Расія).
**13.00** Залатая калекцыя савецкага кінематографа. Музычная камедыя «Гусарская балада» (СССР).
**14.45** Відэафільм АТН «Бялыніцкія таямніцы» цыклу «Зямля беларуская».
**15.00** Навіны.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Вакол планеты.
**16.10** Відэафільм АТН «Мары спраўджваюцца». Фільм «Мінск - Брусэль».
**16.35** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**17.30** «Мінскі бенефіс Кіма Брэйтбурга». Канцэрт. 2-я частка.
**18.15** «Ваша лато».
**19.05** Латарэя «Пяцёрачка».
**19.15** Меладраматычны серыял «І падае снег...» (Расія). 5-я і 6-я серыі.
**21.00** Панарама.
**21.35** Навагодні тыдзень на Першым. Сольны канцэрт народных артыстаў Беларусі Ядвігі Паплаўскай і Аляксандра Ціхановіча.
**22.45** Фільм тыдня. Крымінальная камедыя з Джорджам Клуні, Бэдам Пітам і інш. «Адзінаццаць сяброў Оушэна» (ЗША - Аўстралія).
**00.55** «Уласнай персонай».
**01.25** Моладзевы гумарыстычны серыял «Клава, давай!» (ЗША).

---

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00** Нашы навіны.
**09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.40** Фільм «Сватаўство гусара».
**10.50** Камедыя «Не можа быць».
**12.30** Тэлечасопіс «Саюз».
**13.00** Мультфільм.
**13.25** Камедыя «Чарадзеі».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Вялікая розніца». Навагодні выпуск.
**17.45** «Навагодняя гумарыстычная дыскатэка».
**18.50** Прэм'ера. Камедыя «Прыгажуня і пачвара». ЗША, 2008.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Успамінаючы Аляксандра Абдулава.
**22.05** Фільм «Той самы Мюнхгаўзен».
**00.35** «Легенды «Рэтра FM».

---

**07.05** Фільм-казка «Дванаццаць месяцаў». СССР, 1972 г.
**09.25** Прыгодніцкі фільм «Віват, гардэмарыны!». СССР, 1991 г.
**11.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**12.20** Камедыя «Добры дзень, я ваша цётка!». СССР, 1975 г.
**14.05** «Дарагая перадача».
**14.40** Камедыя «Манія велічы». Францыя-Італія-Іспанія-ФРГ, 1971 г.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Народжаныя ў СССР».
**17.20** «Нататкі Прадказамуса». Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Мінск-2008».
**19.30** «24 гадзіны».
**19.55** Фільм «Пяты элемент». Францыя, 1997 г.
**22.10** Камедыя «Бегляк». Францыя, 1986 г.
**23.45** Фільм «Так далёка, так блізка або неба над Берлінам 2». Германія, 1993 г.
**02.10** «Срэбны галёш».

---

**07.45** Дакументальна-пазнавальны серыял «Сардэчна запрашаем у маю краіну» (Францыя).
**08.15** Серыял для дзяцей «Олівер Твіст» (Вялікабрытанія-ЗША).
**09.00** Свая кампанія.
**10.05** Героіка-прыгодніцкі анімацыйны фільм «Дабрыня Нікіціч і Змей Гарыныч» (Расія).
**11.15** Жаночая ліга.
**11.45** Школа рамонту.
**12.45** Невытлумачальна, але факт.
**13.45** «Лабірынты: гаспадыня Марыя Патоцкая».
**14.15** «Запал па культуры». Ток-шоў.
**14.45** «Касмаполітэн». Відэаверсія.
**16.00** Эксцэнтрычная камедыя «На белым кацеры!...» (Украіна). 1-я і 2-я серыі.
**18.35** «Спорт, спорт, спорт...».
**19.05** Жаночая ліга.
**19.35** Героіка-прыгодніцкі анімацыйны фільм «Алёша Паповіч і Тугарын Змей» (Расія).
**21.05** Народная камедыя «Асаблівасці нацыянальнага палявання ў зімовы перыяд» (Расія).
**22.35** Калядная меладрама «Чужы квіток» (ЗША).
**00.30** «Казанова». Тэлечасопіс для мужчын.

### РОССИЯ

**07.00** «Акцёрскія байкі».
**07.55** Фільм «Чараўнік Смарагдавага горада». 1994 г.
**09.05** «Гарадок.». Дайджэст.
**09.40** «Суботнік». Навагодні выпуск.
**10.30** «Ранішняя пошта».
**11.40** «Пакой смеху».
**13.00** Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Новае прызначэнне». Фільм 2. «Канец фільма». 1 серыя.
**14.00** Весткі.
**14.15** Фільм «Год Залатой Рыбкі». 2007 г.
**16.30** Юбілейны канцэрт Р.Паулса на «Новай хвалі».
**19.00** Весткі.
**19.20** Прэм'ера. «Гумар года». Частка другая.
**21.50** Прэм'ера. Камедыя «Ванька Грозны». 2008 г.
**23.45** Музычная камедыя «Тытунёвы капітан». 1972 г.
**01.15** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**06.10** Вестэрн «Вадаспад анёла».
**08.00** Сёння.
**08.20** Камедыя «Грэгуар Мулен супраць чалавецтва».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.55** «Кулінарны паядынак».
**11.55** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** Камедыя «Чатыры таксісты і сабака -2».
**16.00** Сёння.
**16.25** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**17.15** Дэтэктыўны серыял «Мой ласкавы і далікатны мент».
**19.00** Сёння.
**19.30** Камедыя «Чацвёра пахаванняў і адно вяселле».
**21.20** Паліцыянт дэтэктыў «Падвойная ракіроўка».
**23.20** Крымінальная драма «Брудныя любаты».
**01.05** Фільм «Помста».

### EUROSPORT

**09.30** Ралі. Ралі рэйд. Дакар. 0-ы этап.
**10.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Гарміш-Партэнкірхен). HS 140.
**11.45** Лыжнае двабор'ства. Кубак свету ў Германіі (Шонах). HS 134. Прамая трансляцыя.
**12.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Чэхіі (Нове Места). Мужчыны і жанчыны. Спрынт вольным стылем.
**13.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Італіі (Валь Дзі Фіем). Жанчыны. 10 км класічным стылем. Мас-старт.
**13.30** Лыжнае двабор'ства. Кубак свету ў Германіі (Шонах). HS 134.
**13.45** Лыжнае двабор'ства. Кубак свету ў Германіі (Шонах). Камандныя спаборніцтвы. 4х5 км. Прамая трансляцыя.
**14.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Аўстрыі (Інсбрук). Кваліфікацыя. Прамая трансляцыя.
**16.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Італіі (Валь Дзі Фіем). Мужчыны. 20 км класічным стылем. Мас-старт. Прамая трансляцыя.
**17.30** Дартс. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі. 1-ы дзень. Прамая трансляцыя.
**18.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Італіі (Валь Дзі Фіем). Жанчыны. 10 км класічным стылем. Мас-старт.
**19.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Аўстрыі (Інсбрук). Кваліфікацыя.
**20.15** Ралі. Ралі рэйд. Дакар. 1-ы этап. Прамая трансляцыя.
**20.30** Дартс. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі. 1-ы дзень. Прамая трансляцыя.
**23.00** Дартс. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі. 1-ы дзень.
**00.00** Ралі. Ралі рэйд. Дакар. 1-ы этап. Прамая трансляцыя.
**00.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Аўстрыі (Інсбрук). Кваліфікацыя.
**02.15** Ралі. Ралі рэйд. Дакар. 1-ы этап.

---

**04.55** Афіша.
**05.00** Праграма «Вёска дурняў» серыя 4.
**05.30** Чарадзейныя казкі. Мультфільм «Пінокіо».
**06.30** Серыял для дзяцей «Лэсі і рэнджэр Коры» 47 серыя.
**07.00** Здабытак рэспублікі. Дзень узбекскага кіно. Вакацыі Маст. фільм Прыгоды Алі-Бабы і сарака разбойнікаў» 2 серыя.
**08.25** Дак. серыял «Падводная адысея каманды Кусто» 158 серыя.
**09.00** Ток-шоў «Слова за слова». Паўтор ад 2 студзеня.
**10.00** Тэлесерыял «Па матывах аповядаў Шукшына» 5 серыя. Паўтор ад 2 студзеня.
**11.00** Праграма «Вёска дурняў» серыя 16.
**11.30** Нашы каханыя камедыі. Маст. фільм «Жарты ў бок!».
**13.30** Чарадзейныя казкі. Мультфільм «Пінокіо». Паўтор ад 06.30.
**14.30** Серыял для дзяцей «Лэсі і рэнджэр Коры» 47 серыя.
**15.00** Навіны Садружнасці.
**15.20** Праграма «Вёска дурняў» Серыя 4. Паўтор ад 06.00.
**15.55** Праграма «Квіток на сёння».
**16.00** Маст. фільм «Спартак і Калашнікаў».
**18.00** Навіны Садружнасці.
**18.20** Навіны Садружнасці. Культура.
**18.30** Тэлесерыял «Па матывах аповядаў Шукшына» 6 серыя.
**19.30** Ток-шоў «Слова за слова».
**20.30** Маст. фільм «Таленавіты містэр Рыпі».
**22.30** Нашы каханыя камедыі. Маст. фільм «Жарты ў бок!». Паўтор ад 12.30.
**00.30** Праграма «Вёска дурняў» Серыя 16. Паўтор ад 12.00.
**01.00** Маст. фільм «Спартак і Калашнікаў». Паўтор ад 17.00.
**03.00** Маст. фільм «Таленавіты містэр Рыпі». Паўтор ад 21.30.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 4 СТУДЗЕНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**06.15** Моладзевы серыял «Сэрца акіяну».
**06.40** Гістарычная драма «Паветраныя змеі» (Францыя).
**08.30** Альманах вандраванняў.
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.05, 11.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.15** Арсенал.
**09.40** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым».
**10.10** Культурныя людзі.
**10.45** Усе стыхіі.
**11.20** У свеце матораў.
**12.10** Дак. фільм. Невядомая версія» (Расія).
**13.05** Лірычная камедыя «Дзяўчаты» (СССР).
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Nota Bene.
**16.00** Відэафільм АТН «Мары спраўджваюцца». Фільм «Мінск - Берлін».
**16.25** Анімацыйная камедыя «Трыа з Бельвілю» (Францыя - Бельгія - Канада).
**17.55** Суперлато.
**18.50** Меладраматычны серыял «І падае снег...» (Расія). Заключныя серыі.
**20.35** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** «Панарама тыдня».
**22.10** Навагодні тыдзень на Першым. Сольны канцэрт А.Хлястова.
**23.15** Дзённік V Каляднага міжнароднага турніру аматараў хакею на прыз Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.
**23.35** Прэм'ера. Эксцэнтрычная камедыя «Школа нягоднікаў» (ЗША).

**07.00** Нядзельная раніца.
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.55** Камедыя «Дзелавыя людзі».
**11.20** Разумніцы і разумнікі.
**12.05** Ранішняя пошта.
**13.05** «Зваротны адлік». «Маніфест Жылуновіча».
**13.35** «Хвіліна славы». Гала-канцэрт.
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** Міжнародная панарама.
**16.40** Тэорыя неверагоднасці. «Жывая вада».
**17.45** Фільм «Начны дазор».
**20.00** Контуры.
**21.05** Фільм «Дзённы дазор».
**23.45** «Камедзі Клаб».

**07.05** Фільм-казка «Тры арэшкі для Папялушкі». Чэхаславакія-Германія, 1973 г.
**08.35** «Аўтапанарама».
**09.05** Прыгодніцкі фільм «Гардэмарыны 3».
**11.00** «Вялікі сняданак».
**11.35** «Добры дзень, доктар!».
**12.05** Камедыя «Трое ў лодцы, не лічачы сабакі». СССР, 1979 г.
**14.25** «Дарагая перадача».
**14.50** Фільм «Новая старая казка». 2007 г.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Культурнае жыццё».
**17.20** «Няхай жыве тое, дзякуючы чаму мы, нягледзячы ні на што!». Канцэрт М.Задорнава.
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень».
**20.30** Фільм «Клуб няўдачніц «. Германія-Вялікабрытанія, 2001 г.
**22.30** Фільм «Анёл-А». Францыя, 2005 г.
**00.00** СТБ прадстаўляе: «Дванаццаць месяцаў». Тэлевізійны музычны фільм.
**00.55** «Двое ля елкі, не лічачы сабакі». Навагодняя гісторыя.

**07.40** Дабравест.
**08.10** Мір вашай хаце.
**08.20** Бухта капітанаў.
**09.00** Наша пяцёрачка.
**10.05** Героіка-прыгодніцкі анімацыйны фільм «Алёша Паповіч і Тугарын Змей».
**11.30** Медычныя таямніцы.
**12.05** Хакей. НХЛ. Пітсбург - Фларыда.
**13.45** Пасоўванне +.
**14.05** Гаспадар.
**14.30** «Спявай, душа. by».
**15.05** Меладраматычны серыял «Дзве зоркі» (Індыя).
**17.25** Жаночая ліга.
**17.55** Эксцэнтрычная камедыя «Шырлі-мырлі» (Расія).
**20.45** «Правы чалавека».
**21.00** Прэм'ера. Моладзевы музычны фільм «Трымай рытм» (ЗША).
**23.10** Свая музыка.
**23.40** Пасоўванне +.
**00.10** Трагікамедыя «Чамскрабер» (ЗША-Германія).

**07.00** Фільм «Свістун». 1993 г.
**08.10** Камедыя «Людзі і манекены».
**12.00** Прэм'ера. «За кулісамі «Крывога люстэрка».
**13.00** Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Новае прызначэнне». Фільм 2. «Канец фільма». 2 серыя.
**14.00** Весткі.
**14.15** Фільм «Жыццё адно». 2003 г.
**16.15** «Смеханастальгія».
**16.50** Прэм'ера. «Ізмайлаўскі парк». Вялікі гумарыстычны канцэрт.
**19.00** Весткі.
**19.20** «Крывое люстэрка». Навагодні выпуск.
**21.30** Фільм «Ванечка». 2007 г.
**23.35** Фільм «След дажджу». 1991 г.
**01.10** Заканчэнне эфіру.

**06.25** Камедыя «Чацвёра пахаванняў і адно вяселле».
**08.00** Сёння.
**08.15** Камедыя «Каралева бензакалонкі - 2».
**10.00** Сёння.
**10.20** Дэтэктыўны серыял «Сустрэчная паласа».
**13.00** Сёння.
**13.25** Дэтэктыўны серыял «Сустрэчная паласа» (працяг).
**14.25** Музычная меладрама «Брудныя танцы-2».
**16.00** Сёння.
**16.25** Серыял «Вяртанне Мухтара».
**17.15** Дэтэктыўны серыял «Мой ласкавы і далікатны мент».
**19.00** Сёння.
**19.30** Камедыйны баявік «Васабі».
**21.20** Паліцыянт дэтэктыў «Падвойная ракіроўка -2».
**23.30** Крымінальная драма «Крэйзі».

**09.30** Ралі. Ралі рэйд. Дакар. 1-ы этап.
**10.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Аўстрыі (Інсбрук). Кваліфікацыя.
**10.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Харватыі (Заграб). Жанчыны. Слалам. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**11.30** Лыжнае дваяборства. Кубак свету ў Германіі (Шонах). HS 134. Прамая трансляцыя.
**12.15** Санкавы спорт. Кубак свету ў Германіі (Кенігзее). Мужчыны. Кенігзее (Германія). 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**13.15** Горныя лыжы. Кубак свету ў Харватыі (Заграб). Жанчыны. Слалам. 1-я спроба.
**13.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў Харватыі (Заграб). Жанчыны. Слалам. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**14.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Італіі (Валь Дзі Фіем). Жанчыны. Гонка пераследу. Прамая трансляцыя.
**14.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Аўстрыі (Інсбрук). HS 130. Прамая трансляцыя.
**16.30** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Італіі (Валь Дзі Фіем). Мужчыны. Гонка пераследу. Прамая трансляцыя.
**17.15** Лыжнае дваяборства. Кубак свету ў Германіі (Шонах). 4х5 па сістэме Гундэрсена.
**18.00** Дартс. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі. 2-і дзень. Прамая трансляцыя.
**19.45** Зімовыя віды спорту. Агляд снежнага ўік-энду.
**20.15** Ралі. Ралі рэйд. Дакар. 2-і этап. Прамая трансляцыя.
**20.30** Дартс. Чэмпіянат свету ў Вялікабрытаніі. 2-і дзень. Прамая трансляцыя.
**23.00** Бокс. Паядынак за аб'яднаны тытул Чэмпіёна свету ў ЗША.
**00.00** Ралі. Ралі рэйд. Дакар. 2-і этап. Прамая трансляцыя.
**00.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Аўстрыі (Інсбрук). HS 130.
**01.45** Ралі. Ралі рэйд. Дакар. 2-і этап.

**04.55** Афіша.
**05.00** Праграма «Вёска дурняў».
**05.30** Чарадзейныя казкі. Мультфільм «Дзюймовачка».
**06.30** Серыял для дзяцей «Лэсі і рэнджэр Коры».
**07.00** Здабытак рэспублікі. Дзень узбекскага кіно. Маст. фільм «Новыя прыгоды Акмаля».
**08.25** Дак. серыял «Падводная адысея каманды Кусто» 159 серыя.
**09.00** Ток-шоў «Слова за слова».
**10.00** Тэлесерыял «Па матывах аповядаў Шукшына» 6 серыя. Паўтор ад 3 студзеня.
**11.00** Праграма «Вёска дурняў».
**11.30** Казкі нашага дзяцінства. Маст. фільм «Царэвіч Проша».
**13.30** Чарадзейныя казкі. Мультфільм «Дзюймовачка». Паўтор ад 06.30.
**14.30** Серыял для дзяцей «Лэсі і рэнджэр Коры».
**15.00** Навіны Садружнасці.
**15.20** Праграма «Вёска дурняў».
**15.55** Праграма «Квіток на сёння».
**16.00** Маст. фільм «Прадаецца дэтэктар хлусні».
**18.00** Навіны Садружнасці.
**18.20** Навіны Садружнасці. Культура.
**18.30** Тэлесерыял «Прыгоды чараўніка». 1 серыя.
**19.30** Ток-шоў «Слова за слова».
**20.30** Маст. фільм «Бруднае каханне».
**22.30** Казкі нашага дзяцінства. Маст. фільм «Царэвіч Проша».
**00.30** Праграма «Вёска дурняў».
**01.00** Маст. фільм «Прадаецца дэтэктар хлусні».
**03.00** Маст. фільм «Бруднае каханне».

# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Газета «Новы час» працягвае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк**

### Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации
Республики Беларусь
№ ________ (по реестру ф. 11)
№ ________ (по реестру ф. 10)

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты "Новы час"

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
|---|---|---|---|

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на ____________ руб.
(сумма прописью)

Кому Куда — Г-та "Новы час", р/с 3012211080010 фил. МГДОАО "Белинвестбанк", код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11

От кого ____________
Адрес ____________
(почтовый индекс и подробный адрес)

### Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у аддзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|

Период подписки указывает абонент
Плательщик
Пеня
Всего
Кассир

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|

Период подписки указывает абонент
Плательщик
Пеня
Всего
Кассир

ПРАТЭСТ

# У ГРЭЦЫІ ЁСЦЬ УСЁ. НАВАТ АНАРХІСТЫ

Іван БІЧ

**Вось ужо месяц у Грэцыі працягваюцца сутычкі анархістаў і паліцыі, выкліканыя забойствам паліцэйскім падлетка — удзельніка маніфестацыі. Нідзе ў Еўропе анархісты не маюць такой палітычнай вагі, як у гэтай краіне. У чым карані грэчаскага феномену?**

Арганізаваны анархічны рух у Грэцыі ўзнік у 1860 годзе. Яго піянерамі былі грэкі, які бралі ўдзел у вайне за аб'яднанне Італіі. Там яны пазнаёміліся з вучэннем Міхаіла Бакуніна і па вяртанню на радзіму пачалі больш-менш сістэмную прапаганду ідэі грамадства без дзяржавы.

Эмануіл Дадаоглус — гандляр са Смірны — лічыцца бацькам грэчаскага анархізму. Ён уступіў у секцыю Першага інтэрнацыяналу ў Неапалі падчас антыманархічнага паўстання. Там жа, у Неапалі, ён сустрэў Марыю Панзані — прафесійную прастытутку, якая кінула сваю прафесію дзеля рэвалюцыі. Пара вярнулася ў Грэцыю, дзе заснавала першы гурток анархістаў. У 1863 годзе яны спрабавалі выдаваць газету «Святло», якая існавала некалькі гадзін. Увесь наклад быў канфіскаваны паліцыяй у друкарні. Калі Эмануіл памёр, Марыя збегла ў Парыж, дзе загінула на барыкадах Парыжскай камуны.

У 1876 годзе ў краіне была створана першая арганізацыя «Дэмакратычная асацыяцыя», якая паспрабавала стаць сябрам бакунінскай Міжнароднай асацыяцыі працоўных. Цікава, што падчас прыёму грэкам прыйшлося даказваць, што Грэцыя — гэта незалежная дзяржава. У Еўропе да таго лічылася, што Грэцыя — частка Турцыі.

Наступным разам анархісты далі пра сябе знаць толькі ў 1903 годзе: у Салоніках пачала дзейнічаць групоўка «лодачнікі». Сябры групы, пераважна балгары, рабавалі банкі, цягнікі, падкладвалі міны пад нафтавыя трубаправоды і водаправоды. «Лодачнікі» — загадковая група, якая скончыла сваё існаванне пасля няўдалай спробы падарыву фабрыку. Бомба не ўзарвалася. Тэрарысты збеглі і былі забітыя падчас штурму дому, дзе схаваліся.

Пасля ліквідацыі банды пра анархістаў у Грэцыі не было чуваць аж да пачатку 70-х, калі яны нечакана сталі ўплывовай фракцыяй студэнцкага руху супраць дыктатуры «чорных палкоўнікаў». Росту папулярнасці спрыяла мода на левы радыкалізм, якая ахапіла еўрапейскую моладзь пасля студэнцкай рэвалюцыі 1968 года.

Лічыцца, што галоўным фактарам кансалідацыі анархічнага руху ў Грэцыі стаў крызіс шматлікіх леварадыкальных арганізацый, якія былі актыўнымі падчас дыктатуры. Пасля перамогі дэмакратыі іх уплыў на грамадства стаў мінімальным. Сябры груповак сыходзілі ў лакальныя аўтаномныя праекты кшталту сельскіх кааператываў. Філасофія такіх ініцыятыў цалкам пасавала ідэям анархістаў аб ідэальным грамадстве як федэрацыі малых прамысловых адзінак, якія пабудаваныя на прынцыпе базавай дэмакратыі.

Папулярнасці анархістаў таксама спрыяла фармаванне ўраду сацыялістаў і камуністаў у 80-я гады. У выніку шматлікія грэкі, якія лічылі сябе левым і адначасова праціўнікам ураду, пачалі ідэнтыфікаваць сябе з анархістамі.

У сярэдзіне 80-х урад паспрабаваў праводзіць непапулярныя рэформы, што прывяло да масавых вулічных пратэстаў, дзе галоўную скрыпку выконвалі анархісты.

У Афінах на той час яны штодзень (!) праводзілі дэманстрацыі. Амерыканскае пасольства нават прыпыніла сваю працу на гэты перыяд. Вашынгтон у свой час падтрымліваў дыктатуру, таму ўсе янкі ў вачах анархістаў лічыліся заклятымі ворагамі.

Кульмінацыі пратэсты дасягнулі, калі паліцыя забіла падлетка. Анархісты адказалі акупацыяй хімічнага універсітэту ў Афінах. Самай буйнай акцыяй таго часу стала іх атака на гатэль «Caravel», дзе праходзілі зборы правых радыкалаў з удзелам лідэра французскага Нацыянальнага Фронту Жан-Мары Ле Пэна.

Хутка, аднак, пакаленне 80-х пачало сыходзіць з актыўнага палітычнага жыцця. Новы этап надышоў у 1991 годзе, калі студэнты пачалі кампанію за аўтаномію ВНУ. І зноў з-за слабасці левых рэфармісцкіх партый рух патрапіў пад кантроль анархістаў. Па ўсёй краіне імі былі захоплены калі 1500 школьных устаноў. Каталізатарам выбуху таксама стала забойства сябрам кіруючай у краіне кансерватыўнай партыі «Новая дэмакратыя» настаўніка левых поглядаў. Атмасфера разрадзілася толькі пасля адстаўкі міністра адукацыі.

Апошні раз анархісты гучна заявілі пра сябе ў 1995 годзе, захапіўшы політэхнічны універсітэт. Пасля гэтага іх уплыў на грамадства быццам пачаў падаць, аднак іх структуры дасюль вельмі моцныя.

З размоваў з самімі анархістамі з Пелапанесу вынікае, што тамашнія анархісты — гэта аналаг «браткоў». Калі беспрацоўная моладзь у былым СССР ідзе ў бандыты, то ў Грэцыі — у анархісты. Там існуюць свае аўтарытэты, градацыя паміж сябрамі. Аднак грэчаская анарха — больш талерантная крымінальная (нават, лепш сказаць, хуліганская) субкультура: у ёй няма жорсткай іерархіі, вітаецца інтарэс да літаратуры, адукацыі. Слабымі месцам руху безумоўна з'яўляецца дэфіцыт канструктыўнай праграмы.

Так ці інакш, мы з'яўляемся сведкамі ўжо трэцяй хвалі грэчаскага анархізму. Здольнасць руху да аўтаматычнага абнаўлення кадраў сведчыць пра ягоны сацыяльны характар. Такім чынам, Афіны мусяць прызнаць, што прамымі атакамі разбурыць субкультуру анархістаў немагчыма. Патрэбны эфектыўныя рэформы супраць моладзевага беспрацоўя, ахвяры якога ідуць у анархісты. Пра сацыяльныя карані грэчаскага анархізму гаворыць і той факт, што пратэсты анархістаў падтрымалі прафсаюзы, амаль усе лідэры якіх пачыналі як аматары Махно і Крапоткіна.








## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Як Мінск будзе адпрацоўваць атрыманыя «прымальныя ўмовы», пакуль не зразумела. Аднак эксперты не выключаюць, што ў рахунку, які выставіла Масква, можа фігураваць кантрольны пакет акцый «Белтрансгазу». Раней «Газпрам» неадназразова заяўляў пра свой інтарэс да падобнага кантракту. Саступка расійскай манаполіі 25 працэнтаў кампаніі ўжо аднойчы дапамагла Мінску стрымаць рост газавых коштаў. Не выключана, што платай за цяперашнія цэнавыя прэферэнцыі стане яшчэ 25 працэнтаў нацыянальнага энергетычнага холдынгу.

**«Газета» (Расія)**

Еўрапейскі Саюз ужо другі раз за апошнія два тыдні ўхвальна адгукнуўся аб беларускім самадзержцы. Напрыканцы лістапада 2008 года пасля трохгадовай забароны ўлады дазволілі продаж апазіцыйных друкаваных выданняў — «Наша Ніва» і «Народная воля». Тым не менш Ханс Йохен Шмідт — кіраўнік прадстаўніцтва АБСЕ ў Мінску — крытычна ацэньвае новы беларускі закон аб рэгуляцыі СМІ. Ён баіцца, што дырэктывы, якія ўступаюць у сілу, з 2009 года могуць быць распаўсюджаныя і на інтэрнэт-СМІ, і прывядуць да яшчэ больш жорсткага кантролю над інфармацыйнай прасторай.

**«Frankfurter Rundschau» (Германія)**

Вы заўважылі, што ў бацькі Лукашэнкі заўсёды атрымліваецца нас абдурыць? У каханні і сяброўстве прысягае, аднак доказаў вернасці не дэманструе. Нават Нікарагуа прызнала Паўднёвую Асецію і Абхазію, Самалі прызнала, а беларусы крычалі «брава», гучна пляскалі ў далоні, аднак прызнаць, як кажа Мядзведзеў, правасуб'ектнасць Паўднёвай Асеціі і Абхазіі не спяшаюцца. Замялі пытанне. А вось пра крэдыт памятаюць і просяць усё больш і больш. Не хацелі ў рублях плаціць, а раптам захацелі. З чаго гэта? Газ да іх ідзе сапраўдны, а рублі за газ — дзеравяныя. А нашы як упруцца ў нейкую ідэю, так вакол сябе больш нічога і не бачаць. Усё мараць пра тое, што Масква ператварыцца ў фінансавы цэнтр свету, а рубель — у сусветную рэзервовую валюту.

**«Эхо Москвы» (Расія)**

Адсюль і адзіны вынік доўгіх перамоў у Крамлі — максімальна размытая фармулёўка аб дасягненні дамоўленасці аб «асноўных прынцыпах у сферы паставак і аплаты газу Беларусі на наступны год». Дарэчы, у «Газпраме» ў панядзелак вынікі перамоваў не каментавалі, што дазваляе зрабіць меркаванне, што гарантый паставак газу ў Беларусь з Расіі дасюль яшчэ няма, паколькі не ўзгаднілі канчатковую цану.

**«Росбалт» (Расія)**

Беларускую стабільнасць у мінулым годзе спраўна падтрымлівала Расія. Кожны з беларусаў павінен быў аддаць да новага года Расіі 400 долараў ЗША. Якраз такі кошт гадавых расійскіх прэферэнцый. Іншыя аналітыкі яшчэ больш радыкальныя ў лічбах: з расійскіх крэдытаў на кожнага беларуса выпадае па адной тысячы долараў, кажуць яны.

**«Deutsche Welle» (Германія)**

КРЫЗІС

# КАНЕЦ СВЕТУ

**Адключэнні гарачай вады і святла, абвал курсу нацыянальнай валюты, катаклізмы надвор'я, выбух крыміналу, татальная дыскрэдытацыя дзяржаўнай адміністрацыі і заканадаўчай улады... Журналіст «НЧ» Алег Новікаў выпадкова апынуўся ў пекле ўкраінскага эканамічнага крызісу.**

Перш за ўсё трэба зразумець, што нягледзячы на ўсе мінорныя паказчыкі эканамічнай статыстыкі, знешне сітуацыя ва Украіне выглядае цалкам прыстойна: працуюць крамы, транспарт, установы. Пра прысутнасць крызісу больш за ўсё гаворыць хіба што незвычайная цішыня ў вагонах метро. Людзі мала размаўляюць, сталі больш думаць пра заўтрашні дзень.

«Хутчэй я памру, чым гэта здарыцца, — сказаў у пазамінулы чацвер кіеўскі мэр Леанід Чарнавецкі. Пад словам «гэта» ён меў на ўвазе пагрозу адключэння ў кватэрах гарачай вады. У пятніцу гарачай вады ў кранах і батарэях шматлікіх раёнаў сапраўды не стала. Не паразумеліся між сабой муніцыпалітэт і Мінэнерга. Адначасова па гораду пачалі хаатычна выключаць святло. Часам гэта выглядала дастаткова прагрэсіўна: у нейкім багатым клубе — цемра, а побач звычайная «хрушчоўка», вокны якой асветленыя.

Ваду пачалі паступова даваць у панядзелак, аднак на гэты момант праблема прыняцця душу адышла на другі план. З пачатку тыдня на валютным рынку Украіны назіраўся татальны абвал грыўны. Кожны дзень «юань» (прозвішча грыўны з-за яе абрэвіятуры UAH) быў танней у адносінах да долару прыблізна на 15 працэнтаў. Пік інфляцыі быў дасягнуты ў чацвер, калі за «зялёны» давалі дзесяць гетманаў (на білетах Нацбанку Украіны — партрэты гетманаў).

На фінансавым рынку пачалася паніка. Перш за ўсё яна ахапіла тыя пласты насельніцтва, якія ўлетку, калі долар каштаваў чатыры грыўны, узялі валютныя крэдыты на набыццё кватэраў або машын. Праблема даўгоў па крэдытах нечакана выйшла на ўзровень нацыянальнай. У Кіеве былі зафіксаваныя першыя выпадкі, калі з-за нявыплаты па працэнтах была выстаўлена на продаж нерухомасць — былы заклад для атрымання крэдыту. Таксама прыйшлі паведамленні пра першых ахвяр былой крэдытнай ліхаманкі: не маючы магчымасці своечасова аплаціць узносы па займу, некаторыя скончылі жыццё самагубствам.

Затое тыя, хто атрымліваў заробак у доларах, цяпер вядуць шыкоўны лад жыцця. З-за падзення грыўны ім сталі даступныя крамы фірмаў адзення кшталту Timberland або Springfield, што разлічаны на прадстаўнікоў вышэйшай лігі сярэдняй класы. Кашуля тут калісьці каштавала на грыўны прыблізна 30 баксаў, а цяпер удвая танней.

Халява для падобных спажыўцоў законлчылася ў пятніцу, калі Юшчанка наехаў на кіраўніка Украінскага Нацыянальнага банку (НБУ). У наступныя дні НБУ пачаў інтэрвенцыю на біржах. Долар пачаў падаць і цяпер застыў на пазіцыі 7–8 грыўнаў.

Нягледзячы на адносную стабілізацыю, эмацыйны парог ужо пройдзены. Усе рыхтуюцца да новага падзення. Пік крызісу прагназуюць на люты, калі беспрацоўе можа дасягнуць 7–9 працэнтаў.

Крызіс праяўляецца паўсюдна. Напрыклад, кажуць, што вярнуліся 90-я, калі назіраўся крымінальны *«беспредел»*.

«Ну дык вы нічога не ведаеце, — даказвае суседка ў маршрутцы. — Учора мае знаёмыя вярталіся на машыне дахаты і выразшылі падвесці нейкага мінака. Ён дастаў нож і прымусіў іх выходзіць. Машына цю-цю...» Пад уплывам падобных маналогаў пачынаеш уважліва ўглядацца ў пад'езд перад тым, як туды ўвайсці.


Галалёд і бядзейнасць камунальных службаў прымусілі некаторых кіеўлян набываць соль і раскідаць яе перад сабой па вуліцах

Аднак куды больш небяспечным для грамадскай стабільнасці аказалася надвор'е.

У сераду пасля адлігі ў Кіеве ўдарыў мароз. Вынік — галалёд. Толькі за адзін дзень, калі верыць выданню *«Газета по киевски»*, у шпіталі паступіла 135 чалавек з рознымі відамі пераломаў і траўм. Гумар у тым, што напярэдадні кіеўскі мэр гучна і публічна абяцаў зрабіць жыхарам каткі пад Новы год. Зрабіў.

Крызіс плюс холад і галалёд: што можа быць горш? Палітычная анархія. Сярод прадстаўнікоў урадавай эліты назіраецца поўны хаос і адсутнасць адзінага цэнтру прыняцця рашэнняў. Нацбанк, Адміністрацыя прэзідэнта, Рада, урад, Савет нацыянальнай бяспекі — усе гэтыя органы прымаюць пастановы, якія супярэчаць адна адной. На жаль, заканадаўства краіны яшчэ цалкам не ідэальнае. Натуральна, кожны чыноўнік перакладае адказнасць на іншага. Да таго ж усё яшчэ не прыняты бюджэт на наступны год, і якім чынам дзяржава будзе плаціць у студзені пенсіянерам або бюджэтнікам, таксама загадка.


З-за адключэння цяпла ў кіеўскіх школах дзецям дазволі насіць пальчаткі. Гэта выклікала на іх вялікі попыт

Кульмінацыяй узаемных наездаў сярод палітыкаў стала заява Юліі Цімашэнка аб тым, што падзенне грыўны справакаваў Юшчанка і блізкі да яго клан. Мэта — атрымаць як мага больш грошай на спекуляцыях з валютай. Праўда, эксперты хутка вылічылі, што самымі буйнымі банкамі-спекулянтамі ёсць тыя, што фінансуе Блок Цімашэнка. У сваю чаргу, прэзідэнт назваў Юлію «авантурысткай». Сітуацыя даходзіць да смешнага: Цімашэнка збіраецца пачаць кампанію «Украіна без Юшчанкі». У свой час яна праводзіла акцыю «Украіна без Кучмы».

Пакуль адзінай спробай прапанаваць незалежную ад цяперашніх эліт альтэрнатыву стаў «Маніфест сярэдняга класу». Яго аўтар — Юрась Раманенка — выдавец аднаго з часопісаў, які заклікаў праявіць грамадзянскую непакору палітычнай эліце: 22 снежня ў 12 гадзін на Майдане дудзець ў клаксоны машынаў. Але эфект гэтай акцыі быў слабы. На Майдане сабраліся толькі каля сотні чалавек.

«Я ўжо сваё адмёрз», — кажа Слава, выпускнік мастацкай акадэміі, адзін з актывістаў «аранжавай рэвалюцыі», каментуючы заклік Раманекі зноў выходзіць на Майдан.

Куды ахвотней распавядае ён пра апошні прыкол ва ўкраінскім інтэрнэце. Нехта перарабіў кліп з рэкламай Кока-Колы, памятаеце — Санта, які спявае «Свята да нас прыходзіць» на фоне грузавікоў з лейблам напою. Ва ўкраінскім варыянце Санта спявае «Крызіс да нас прыходзіць», а на грузавіках можна пабачыць надпіс «Мівіна» — гэта самы буйны ўкраінскі вытворца вермішэлі хуткага пры гатавання, традыцыйнай ежы мясцовых беднякоў.

МЕРКАВАННЕ

# НОВАЯ ІГНАЛІНА

**Андрыюс Кубіліус нядаўна стаў прэм'ер-міністрам Літвы. Яму трэба будзе вырашыць важную праблему. Па ўмовах уступлення Літвы ў ЕС да снежня 2009 года павінна быць спынена Ігналінская АЭС. Але цяпер Літва лічыць, што працу АЭС трэба падоўжыць яшчэ на 2 гады, каб пазбегнуць недахопу энергіі. Літва не жадае павялічваць імпарт газу з Расіі. Пра гэта і ішла размова прэм'ера з карэспандэнтам «Еўраньюс».**



***— Ці збіраецца ваша краіна выканаць абавязанне зачыніць АЭС, узятае ў момант перамоў аб уступленні ў Еўрасаюз?***

— У доўгатэрміновай перспектыве мы ўпэўненыя ў тым, што разам з Еўрапейскім саюзам, з Еўракамісіяй мы вырашым праблему энергетычнай бяспекі Балтыйскага рэгіёна. Мы ўсё яшчэ працягваем некаторыя абмеркаванні кароткатэрміновых праблем, якія могуць паўстаць пасля закрыцця АЭС. Калі мы яе зачынім да канца 2009 года, два наступных гады будуць для нашай краіны досыць праблематычнымі.

Нам трэба як найхутчэй будаваць, па-першае, электра-энергетычны мост у Швецыю, і гэта дазволіць нам адчуць сябе ў значна большай бяспецы, калі здарыцца якія-небудзь праблемы з электразабеспячэннем.

***— Вы разлічваеце, што электра-энергетычны мост паміж Швецыяй і Літвой будзе гатовы да 1 студзеня 2010 года?***

— У мяне няма адказу на гэта пытанне, але я не ведаю, ці ёсць адказ у Еўракамісіі, што рабіць у пачатку 2010 года Літве, калі мы зачынім АЭС.

***— Складаецца ўражанне, што справа не ў тым, што Расія не зможа забяспечыць энергіяй Літву, а ў тым, што вы не верыце Расіі. Гэта праўда?***

— Закрыццё нафтаправода «Дружба», па якім забяспечваўся нафтаачышчальны камбінат у Мажэйкяе, было зроблена расійскім бокам проста таму, што мы прадалі камбінат не расійскай кампаніі, а польскай. Відома, гэта не ўмацавала нашага даверу да Расіі... Мы сапраўды не ведаем, што адбудзецца далей, аднак шэраг падлікаў паказвае, што няма магчымасці пастаўляць дастаткова электрычнасці, дастаткова газу або вырабляць дастаткова электрычнасці з газу, якім мы будзем забяспечаныя.

***— Вы думаеце, што Вісагінаская АЭС — новая Ігналіна — будзе пабудаваная? Ходзяць чуткі, нібыта праблема палягае ў тым, што Літва імкнецца ўзначаліць праект і жадае кіраваць камандай. Гэта праўда?***

— Відома, мы жадаем пэўнага лідэрства, таму што мы бярэм на сябе вялікія абавязкі, калі прымаем на сваёй тэрыторыі такога кшталту АЭС, але нам трэба вельмі практычная дамова па адсоткавым размеркаванні акцый, аб тым, як правільна вызначыць магутнасць генератараў і іншыя падобныя рэчы. Палякі кажуць, што ім на самай справе трэба ўдзел у нашым праекце новай атамнай электрастанцыі, таму што ім таксама бракуе паставак электрычнасці на паўночным усходзе Польшчы. Магчыма, яны паспрабуюць выкарыстаць удзел у новай Ігналіне як своеасаблівы працэс навучання для саміх сябе, і гэта добра. Я думаю, што ў Польшчы будуць атамныя электрастанцыі, скажам, праз 15 або 20 гадоў. Але цяпер тое, што мы азначылі ў рэчаіснасці, — гэта рухацца наперад з вельмі яснай палітычнай дамовай і вельмі яснай дзелавой дамовай па будаўніцтве Вісагінаскай атамнай электрастанцыі.

Калі вы звернецеся да Літвы або Латвіі, то ясна ўбачыце, што мы сапраўды добра падрыхтаваліся і з дзелавога пункта гледжання, і з фінансавага, і з інфраструктурнага да таго, каб пабудаваць электра-энергетычны мост у Швецыю так хутка, як гэта магчыма.

***— Ці думаеце вы, што без Ігналіны вам будзе цяжэй выконваць абавязальніцтвы, узятыя на сябе краінай у змаганні са зменамі клімату?***

— Я ведаю, што цяпер таксама праходзяць перамовы з Еўракамісіяй аб тым, каб даць нам дадатковы аб'ём эмісійных квот, у нас вельмі яснае бачанне таго, што мы павінны эканоміць энергію, асабліва энергію для абагравання дамоў. Перад намі вялікі выклік у абнаўленні жылля, якое патрабуе ўдвая больш энергіі для абагравання, чым новыя сучасныя дамы. Нам прыйдзецца перарабіць 27 тысяч кватэр. І на гэта спатрэбіцца шмат сродкаў.

***— Як вы думаеце атрымаць гэтыя сродкі?***

— Уся дапамога з боку ЕС, з іншых магчымых крыніц будзе велізарнай каштоўнасцю, эканомія энергіі дазволіць ашчаджаць сродкі, якія выкарыстоўваюцца цяпер, да прыкладу, на закупкі газу ў Расіі, але ў сярэднетэрміновым плане мы сутыкнёмся з вялікім выклікам пры ажыццяўленні такой праграмы.

КЛІМАТ

# ДАЖЫЦЬ ДА КАПЕНГАГЕНА

**У наступным годзе ў Капенгагене ўрады краін свету падпішуць новую дамову пра барацьбу з глабальным пацяпленнем. Наколькі радыкальным будзе яе змест, шмат у чым залежала ад вынікаў падрыхтоўчай канферэнцыі, якая адбылася 6–12 снежня ў Познані. Пра гэта карэспандэнт «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з Янай Кавалеўскай, дэлегатам ад Беларусі.**



***— Што за мерапрыемства адбылося ў Познані?***

— Афіцыйна гэта называлася Канферэнцыя бакоў рамачнай Канвенцыі ААН аб змене клімату разам з 4-й сесіяй сустрэчы бакоў пратаколу ў Кіёта. Галоўнай задачай мерапрыемства стала паленіка наконт зместу новай дамовы, якая павінна прыйсці на змену Кіёцкаму пратаколу ў 2013 годзе. Нагадаю, што Кіёцкі пратакол быў прыняты ў снежні 1997 года. Сутнасць дакумента — самыя развітыя краіны, а таксама краіны з пераходнай эканомікай пагаджаюцца скараціць і стабілізаваць маштабы выкідаў парніковых газаў у перыяд 2008–2012 гадоў. Беларусь — таксама ўдзельніца пагаднення. Адпаведна яму, наша краіна ўзяла на сябе абавязак выкідаць у атмасферу штогод не больш за 110–115 мільёнаў тон парніковых газаў.

***— Чым канкрэтна займаліся ўдзельнікі канферэнцыі?***

— У Познань прыбылі 11 тысяч дэлегатаў. Сярод іх кіраўнікі ўрадаў, напрыклад, Германіі, міністры з 186 краінаў свету. Акрамя таго, у Польшчу прыехалі вядучыя эксперты ў гэтай галіне, бізнесмены, прамыслоўцы, прадстаўнікі грамадзянскіх арганізацый. Галоўнай тэмай дыскусіі была распрацоўка патрабаванняў і рэкамендацый да ўдзельнікаў канферэнцыі ў Капенгагене. Удзельнікі канферэнцыі спрачаліся, наколькі трэба скараціць глабальныя выкіды, як прымусіць некаторыя краіны далучыцца да дамовы, або прымусіць іх выконваць узятыя абавязкі.

**На канферэнцыі быў прыдуманы спецыяльны прыз — «Выкапень дня», які штодзень сімвалічна атрымліваў урад краіны за сабатаж кліматычнага руху ў той ці іншай галіне**

***— Якія краіны лічацца найбольшымі ворагамі руху супраць змены клімату?***

— Такія краіны, як Аўстралія, Канада і Японія працягваюць тармазіць працэс перамоваў, не спяшаюцца ўзяць на сябе абавязкі па скарачэнню выкідаў. ЗША і Кітай увогуле адмаўляюцца прызнаваць існаванне такой праблемы, як пагроза атмасферы. Для іх змены надвор'я — усяго толькі ўплыў нейкіх касмічных працэсаў, кшталту змены арбіты Сонца. Цяперашні прэзідэнт ЗША лічыць, што Кіёцкі пратакол стварае пагрозу вольнаму прадпрымальніцтву. Сярод краін такога кшталту і галоўны саюзнік Беларусі — Расія. На канферэнцыі быў прыдуманы спецыяльны прыз — «Выкапень дня», які штодзень сімвалічна атрымліваў урад краіны за сабатаж кліматычнага руху ў той ці іншай галіне. Дык вось, Расія ўмудрылася за адзін тыдзень двойчы аказацца лаўрэатам гэтай антыпрэміі.

***— Ці можна спадзявацца, што Зямля не стане ахвярай прыроднай катастрофы? На думку эколагаў, якія меры для гэтага патрэбныя?***

— З разліку большасці ўдзельнікаў канферэнцыі, каб выратаваць планету да сярэдзіны XXI стагоддзя трэба скараціць аб'ёмы выкідаў парніковых газаў у атмасферу на 50 працэнтаў. Толькі ў такім разе сітуацыя будзе больш-менш стабільнай. Шмат хто супраць такой лічбы. У любым выпадку шмат надзеяў выклікалі сярод эколагаў вынікі апошніх выбараў у ЗША. Прыход у Белы Дом адміністрацыі дэмакратаў, сярод якіх шмат праціўнікаў кліматычных зменаў, дае шанс спадзявацца, што Штаты далучацца да кліматычнага руху.

***— Як вядома, у канферэнцыі прыняў удзел Альберт Гор — віцэ-прэзідэнт ЗША ў камандзе Біла Клінтана, адзін з лідэраў кліматычнага руху, лаўрэат нобелеўскай прэміі за сваю дзейнасць ў гэтай галіне. Пра што ён казаў у сваёй прамове?***

— Ён якраз казаў пра намер адміністрацыі Барка Абамы далучыцца да Кіёцкага пратаколу. Абранне Абамы, па словах Гора, дазваляе спадзявацца на тое, што дамова, якая будзе падпісана ў 2009 годзе, стане сапраўды рэвалюцыйнай. «Цяпер шлях да падпісання глабальнай дамовы вольны», — сказаў ён.

***— Традыцыйна рух супраць змены клімату вельмі блізкі да руху антыглабалістаў, які вядомы сваімі часам радыкальнымі вулічнымі акцыямі. Ці было нешта падобнае ў Познані?***

— 6 снежня ў горадзе адбылася агульная дэманстрацыя, у якой прынялі ўдзел каля тысячы чалавек. Маніфестанты прайшлі па цэнтры Познані. 12 снежня прыблізна сто актывістаў-эколагаў паспрабавалі заблакаваць уваход у будынак, дзе сабраліся прадстаўнікі ўрадаў. Яны скандзіравалі: «Выжыванне не можа быць тэмай для размоў». Акцыя была арганізавана з падачы лідэраў малых астраўных краін, народы якіх у выніку глабальнага пацяплення могуць проста пайсці на дно акіяну. Ніякіх праяў гвалту падчас акцый не было.

***— Ці была на канферэнцыі закранутая сітуацыя ў Беларусі?***

— Хіба толькі ўскосна. Зараз некаторыя атамныя карпарацыі Еўропы лабіруюць праект уключыць ядзерную энергію ў механізм па скарачэнню выкідаў парніковых газаў. Еўрапейская супольнасць баіцца, што падобны пункт у тэксце капенгагенскай дамовы справакуе бум будаўніцтва АЭС. Эколагі вельмі цікавяцца наступствамі Чарнобыльскай катастрофы ў якасці прыклада таго, якую небяспеку патэнцыйна нясе атамная індустрыя.

***— Якія планы ў беларускіх эколагаў, што займаюцца пытаннем змены клімату?***

— Кансалідаванага беларускага кліматычнага руху няма. Ёсць розныя маленькія ініцыятывы ў рамках грамадскіх арганізацый. Было б добра сустрэцца ўсім, хто цікавіцца гэтай тэматыкай, каб лепш ведаць сітуацыю і каардынаваць дзейнасць. Прынамсі, будучая Канферэнцыя ў Капенгагене — добрая нагода для гэтага.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### АХМЕД АБУТАЛЕБ



Грамадзянін Нідэрландаў мараканскага паходжання, які прыехаў у краіну цюльпанаў ва ўзросце 15 гадоў, стаў першым ў гісторыі эмігрантам, які ўзначаліў гарадскі савет аднаго з галандскіх гарадоў. Прычым не абы-якога гораду, а другога па колькасці насельніцтва — Ратэрдаму. На пасаду мэра ён быў абраны з падачы Партыі працы (нідэрландскія эсдэкі). Перад тым, як стаць бургамістрам, Ахмед працаваў электратэхнікам і журналістам. Потым быў дырэктарам інстытуту мультыкультурнага развіцця. Абранне мараканца на такую высокую пасаду выклікала шмат каментарыяў. Аўтары большасці з іх у прынцыпе пазітыўна ўспрынялі перамогу Абуталеба як сведчанне інтэграцыі мараканскай камуны ў галандскае грамадства. Якраз мараканцы лічацца найбольш крымінальнай групай сярод эмігрантаў. Парадокс у тым, што Ратэрдам шэсць гадоў таму меў абсалютна іншы імідж у плане талерантнасці да замежнікаў. Якраз тут пачаў сваю палітычную кар'еру Пім Фартэйн — правы папуліст, які стрыг купоны на агрэсіўнай антымусульманскай рыторыцы. У выніку партыя Фартэйна нават увайшла ў склад ураду, хаця сам яе лідэр пазней быў забіты ісламскім фанатыкам. Мінула некалькі гадоў, і былыя выбаршчыкі Піма галасуюць за Ахмеда. Нонсенс? Некаторыя лічаць гэты працэс цалкам зразумелым. Выхадзец з Марока, бургамістр Абуталеб можа надаць барацьбе з мараканскім крыміналам новы імпульс і гучанне. Сапраўды, Ахмед праславіўся як аўтар слоў аб тым, што кожны мараканскі эмігрант, які выступіць супраць заходніх каштоўнасцяў, павінен быць дэпартаваны. Ён таксама выступае за скарачэнне сацыяльнай дапамогі беспрацоўным эмігрантам.

### ДАНАТА СУБОТКА

Дэпутат польскага Сейму ад ліберальнай партыі «Грамадзянская платформа» (PO) з парламенцкай трыбуны жорстка асудзіла сяброў кіраўніцтва нацыянальнага тэлебачання за тое, што тыя фінансавалі здымкі серыялу «Лонданцы». Серыял «Лонданцы», які нядаўна выйшаў на польскія экраны, распавядае пра лёс прадстаўнікоў апошняй хвалі польскай працоўнай эміграцыі ў Вялікабрытанію. Як вядома, на пачатку стагоддзя сотні тысяч палякаў, як правіла маладых, адправіліся працаваць на Альбіён. Пра тое, як несалодка ім прыходзілася, і распавядае серыял. Аднак, на думку Суботка і іншых крытыкаў праекту, асабліва з колаў старой шляхетнай польскай эміграцыі, героі «Лонданцаў» выглядаюць маргіналамі. Яны намагаюцца знайсці лёгкі хлеб за кошт нейкіх афер, а стрэс здымаюць з дапамогай наркотыкаў. Яшчэ больш не спадабаўся Данаце вобраз польскіх жанчын, якія, на яе думку, выглядаюць занадта даступнымі ў інтымным плане. Стваральнікі карціны ў сваю чаргу папрасілі Данату і іншых апанентаў спачатку дагледзець да канца 13 серый фільму. Яны таксама ўжылі цікавы аргумент: толькі двое з дваццаці палякаў-эмігрантаў у фільме сядзяць на наркотыках.

### АЛІЯ ІЗЕТБЕГАВІЧ



Першы прэзідэнт Босніі Герцагавіны, які памер ў 2003 годзе, дзіўным чынам працягвае адыгрываць цікавую ролю ў культурнай палітыцы краіны. Мова пра нелюбоў Ізетбегавіча, які быў фанатычным мусульманінам, да Дзеда Марозу (у былой Югаславіі яго называюць Djed Mraz). Увогуле, Djed Mraz — гэта прадукт камуністычных часоў, калі югаслаўскі лідэр Ціта прыдумаў эрзац Святога Міколы. Адзіная розніца — Djed Mraz раздае падарункі не 24 снежня або 7 студзеня, а 31 снежня. Фігура Djeda Mraza выклікала напачатку некаторыя пратэсты сярод каталіцкай і праваслаўнай часткі грамадзян Югаславіі, аднак потым яе палюбілі. Ізетбегавіч, калі стаў баснійскім прэзідэнтам, патрабаваў прыпыніць рэкламу ў медыя «чужароднага элемента» ў чырвонай шапцы і з мехам. Гэтую палітыку працягваюць яго паслядоўнікі. Перад пачаткам навагодніх свят спадарыня Махмутовіч, якая адказвае за сектар школьнай адукацыі ў Сараева, заклікала да кампаніі па знішчэнню культу Дзеда Марозу як латэнтнага камуніста. Аднак кампанія ляснулася. Праблема ў тым, што знешне Святы Мікола (паколькі частка баснійцаў каталікі, гэты персанаж ўлады не чапаюць) і Дзед Мароз мала чым адрозніваюцца, і ісламістам цяжка разабрацца, ад каго атрымліваюць падарункі дзеці. Другая праблема ў тым, што Дзед Мароз даўно стаў атрыбутам навагодняга буму спажывання, і прымусіць бізнес прыпыніць эксплуатаваць гэты вобраз амаль не магчыма. Як не дзіўна, уся гэта гісторыя мае пазітыўны аспект. Аказалася, што каталікі, праваслаўныя і мусульмане Босніі ўсё ж маюць нешта агульнае — любоў да Дзеда Марозу.

НОВАЯ ГЕНЕРАЦЫЯ

# БУНТОЎНА

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**Паводле статуту, моладзевая арганізацыя негвалтоўнага супраціву БУНТ — фантомная ячэйка, супраціў без лідэра. Але калі паўстае патрэба нейкім чынам персаніфікаваць яго дзейнасць, БТ называе яе. Дзяўчына, дзеля якой беларускі АМАП унёс карэктывы ў свой «кодэкс пацана» («Баб не біць!»). Дзяўчына, чыё імя ўжо ў пачатку 2000-х было першай рэакцыяй беларускага інтэрнэту на мужнае слова «зубр». Ёй тады было ўсяго 15. Цяпер ёй 23, і за яе плячыма — 6 страсанняў мозгу і без малага столькі ж год вучобы на філасофскім факультэце. Але адказ на пытанне, кім ёсць гэта грамадзянская актывістка — баевіком руху супраціву ці ўсё ж яго ідэолагам, не ў стане даць ніхто. У тым ліку яна сама. Мая новая гераіня — Тацццяна Елавая.**

## 9:00

Тацццяна Елавая мае каротка пастрыжаныя валасы. Так што зранку часу на прычэсванне марнаваць не даводзіцца. Яе алгарытм — ускочыць з ложка, уключыць кампутар, бегчы чысціць зубы і паспець запарыць гарбату, пакуль не загрузіўся інтэрнэт і адтуль у скайп не пасыпаліся навіны: каго ўночы затрымалі, што ў вечаровых навінах сказала БТ, як там у Грузіі і пытанні — на якім менавіта скрыжаванні Мінску актывіст А. мусіць перадаць актывісту Б. пачак улётак.

Толькі пазнаёміўшыся з Таняй асабіста, я разумею, што супраціў — гэта таксама від творчасці. А яго элементы — палітычныя перформансы, флэшмобы, лагатыпы, расцяжкі, сцягі і графіці — таксама мастацтва. Прыкладное. Прычым БУНТ — яркі ўзор чыстага мастацтва супраціву, роднасны такім еўрапейскім шэдэўрам, як сербскі «ОТПОР!», украінская «Пора», грузінская «Кмара». Роднасны ў тым сэнсе, што таксама прывядзе да кардынальных пераменаў, спадзяецца Таня.

Спецыфічным мастацтвам супраціву Тацццяна Елавая валодае дасканала з дзяцінства. Дзякуючы маці, газету «Свабода» яна пачала чытаць амаль адначасова з азбукай. А вось бацька быў «калгаснік і лукашыст»: біў дачку за палітычныя перакананні, а то і проста так. Яна рана навучылася даваць здачы: у дзіцячым садочку малая трапіла ў лагапедычную групу, дзе апроч яе былі адны мальцы. «З тых часоў і павялося: цацкі — танчыкі, самалёцікі». У 16 год Таня сышла з дому, жыла па штабах апазіцыйных арганізацый.

Яшчэ ў дапатопным беларускім сеціве, зразумеўшы ўсю яго перспектыўнасць, яна агітавала за нязгоду з пануючым рэжымам пад нікам «ТАНЯ-ЗУБР». «Дзяўчынка з неадцісным капслокам у галаве» называлі яе мы. Час прайшоў, і Caps Lock адціснуўся, але прынцыпы засталіся. Падчас васьмідзённай руска-грузінскай вайны ўлетку 2008-га Тацццянін блог http://zmagarka.livejournal.com/ і сайт арганізацыі БУНТ http://www.buntby.com атакавалі хакеры, якім не падабалася, што яна ператварае гэтыя рэсурсы ў стужку навінаў, дзе пададзены прагрузінскі, а не прарасійскі погляд на рэчы.

## 12:30

Сёння пойдзень адзначаны для Тані пазітыўным парушэннем штодзённага раскладу. Адбываецца акцыя. Віленскія грамадзянскія актывісты, сярод якіх і прадстаўнікі БУНТу, пашыхтаваліся на праспекце Гедыміна ў падтрымку Аляксандра Баразенкі, якога ў гэты час судзяць у Мінску. Нас, журналістаў, на пару чалавек болей, чым іх, актывістаў.

Я пытаюся ў Тані, якія асобы служаць ёй прыкладам — у гісторыі і ў наш час. «У гісторыі, як ні смешна гучыць, — Чэ Гевара. Толькі не той, што на майцы за 10 долараў, а той — хворы на астму салдат, які хацеў перавярнуць свет. Канечне, Гевара лявак. Але мне як філасофу казаць, што сацыялізм — абсалютнае зло, проста не выпадае. Ідэалогія не бывае добрай ці кепскай: мы можам альбо прымаць яе для сябе, альбо не. З беларускай гісторыяй цяжэй… Кастусь Каліноўскі. Хоць цяпер у беларускім друку і з'яўляюцца публікацыі па выкрыцці міфу Каліноўскага. Для мяне ўсе, хто змагаўся за волю Бацькаўшчыны, — героі. Шкада, што гісторыя Беларусі і па сёння застаецца для нас невядомаю — вось і прыходзіцца называць энцыклапедычнага Каліноўскага, а не якога-небудзь N.». Сярод сучаснікаў Таня называе сваіх паплечнікаў па руху «ЗУБР», таму самаму, які ці не першы ў Беларусі вярнуў слову «паплечнік» літаральнае значэнне: «Напрыклад, Жэня Афнагель ці Шурык Атрошчанка». Нашы сцяжыны даўно разышліся і не ва ўсіх у добрых кірунках, але калі будзе трэба — мы зноў станем поплеч». У выбары замежных аўтарытэтаў Таня не вагаецца ні хвіліны: «Міша Саакашвілі. За тое, што ён сказаў: незалежнасць вышэй за дэмакратыю. Я згодная». — «Міша?» — «Ну так. Грузіны — мае сябры». — «Значыць, сюжэты БТ пра лагеры баевікоў — праўда?» — «Можа і было б праўдай, калі б было каго ў тыя лагеры адпраўляць. А калі сур'ёзна, то ўзброены супраціў у Беларусі на сённяшнім этапе не толькі нерэальны, але і шкодны. Прэзідэнт Паўлючэнка — гэта не тое, аб чым я мару».

У спісе Таніных герояў няма ніводнай жанчыны, хоць асобе рамантычнай у дачыненні Тані адразу прыйдзе да галавы пастаць французскай вяаркі і святой Жанны Д'Арк. Ці больш блізкае



па духу — беларуская амазонка, валатоўна са старых легендаў. Але і Жанна Д'Арк, і баладная дзяўчына-асілак Вайтоўна ў народнай свядомасці — гэта нязломныя Тэрмінатары ў спадніцах. Таня-Зубр не такая. І не толькі таму, што ходзіць не ў спадніцах. Проста калі Таню б'юць, ёй сапраўды баліць. Але яна ведае: ад гэтага нікуды не падзенешся. Мой тавaрыш-кінааматар падзяляе ўсіх герояў амерыканскіх баевікоў на два тыпы. Дык вось, Таня не Тэрмінатар, засланы з адказнай місіяй у наш час, яна свая, яна — Брус Уіліс, «просты хлопец», які апынуўся не ў той час не ў тым месцы. І, хоцькі-няхоцькі, ратуе Айчыну. Пытаюся ў Тані тое, што даўно карцела: «Гэта праўда, што ты кулаком прагінаеш капот машыны?» — «Не, ты што, гэта ж больна. Ды і хто потым за рамонт плаціць будзе? Раней, калі займалася каратэ і рукапашным боем, яшчэ можна было так жартаваць».

## 15:00

У другой палове дня Таня ходзіць на пары. Яна заканчвае філасофскі факультэт Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта. Адразу па школьных выпускных іспытах Таню забралі «на суткі», уступную кампанію ў БДУ яна прабавіла ў турэмнай бальніцы. З «такімі адзнакамі» ў Мінску бралі толькі ў ЕГУ. Але і там ёй не давалося спакойна павучыцца. У 2004 годзе ўніверсітэт зачынілі. Аднавіць навучанне ўдалося, толькі калі апальная ВНУ перабралася ў Вільню.

«Я за радыкальную практызацыю філасофіі, — кажа Таня. — Мысляры павінны заняцца рэальнымі рэчамі. Цяжкасцямі, якія паўстаюць у постсавецкім соцыуме ў перыяд трансфармацыі. Гэта зусім не значыць, што інтэлектуалы павінны стаць слугамі супраціву, але яны могуць сур'ёзна яго ўзбагаціць. У Беларусі заўважны парадокс: фактычна, мы змагаемся за свабоду краіны ад «дыктатуры» супраць волі народа. Я гэта добра ўсведамляю. Тое, да чаго мы заклікаем, — сёння непатрэбна людзям, яны візнаюць створаны уладамі сімвалічны універсум за рэальна дадзены. Але абсалютна ясна: трэба зрабіць так, каб ім гэта стала патрэбна. Як гэта зрабіць — іншае пытанне. Можна выйсці і стаць у бок, — яна недвусэнсоўна касавурыцца на мяне, — абраць філасофію «ўнутранай свабоды». Гэта вельмі папулярна ў Беларусі сёння, асабліва ў асяродку тых, хто «ўсё разумее». Я разумею, што ўсё кепска, мы ў меншасці, што апазіцыя маргіналізавана і бізнесіфікавана, што «лібералізацыі» толькі заганяюць нас у кут, але адступаць нельга. На жаль, у сілу розных прычынаў вулічныя акцыі вялікага плёну не даюць. Я лічу, што сёння яны хутчэй выступаюць фонам: глядзіце, апазіцыя жывая. Сённяшняя задача БУНТу — не палымяные кіданне на барыкады, а акумуляцыя пэўнай часткі свядомай моладзі (каб зусім не разбегліся па хатах), выхаванне з яе будучых кадраў для «сярэдняга звяна», якія ой як будуць патрэбныя ў перыяд, набліжаны да дня Х. Таму вялікае значэнне мы надаём трэнінгам — як для галавы, так і для загартоўвання духа праз фізуху».

Гэтак думка і дзеянне прыходзяць у яе галаве да кампрамісу.

## 19:00

Мы заходзім у тыпавую кватэру ў адным з віленскіх спальных раёнаў. Таня здымае тут пакой. Асноўная крыніца яе даходаў — невялікая фірма па продажы і рамонту ноўтбукаў. «Заходнія донары пераканаготы, што мы працуем на ФСБ. Бо дакладна ведаюць, што самі грошай нам не давалі, а лаяльнай да «хуліганаў» алігархіі ў Беларусі яшчэ не вырасла. У «шчырасць беларускіх патрыётаў» Захад не верыць. Плюсуйце да гэтага бясконцыя скандалы вакол нашага руху: наркотыкі, знікненні, інфільтрацыя, незразумелыя крымінальныя справы, інтэрнэт-аферы. Тут не тое, што ФСБ — Масад узгадвеацца. Стаўленне да нас у асяродку апазіцыі — хутчэй не як да канкурэнтаў, а як да вар'ятаў. Мо па-свойму яны і маюць рацыю. Увесь сакрэт у тым, што грошы ў нас — ніадкуль. Негвалтоўны супраціў — не такая ўжо дарагая справа. Праца актывістаў — выключна на энтузіязме. Трэба аплочваць неабходны мінімум: улёткі, фарба для графіці, тое-сёе для акцый. Урэшце, стос паперы можна бясплатна раздрукаваць на працы, расцяжкі пашые бабуля са старых прасцін, а татаў гараж можна скарыстаць пад склад. Сям'я — крыніца ўсяго гэтага дабра, і я заўжды заклікаю нашых людзей пачынаць рэкрутаванне менавіта з родных — яны не так часта падводзяць, як людзі з вуліцы. У сітуацыі невялікай колькаснасці актывістаў моладзевых структур гэта падаецца не такім смешным, як на першы погляд». Такая пазіцыя, сцвярджае Таня, супрацьстаіць філасофіі грантасмоцтва: «Ты не толькі можаш цешыць сваё Ego чыстым сумленнем, але ты і да справы ставішся з большай адказнасцю: надрукаваную за свой кошт улётку не так проста выкінуць у сметнік».

## 20:00

У канцы 1980-х маладыя сем'і ехалі з усёй Беларусі ў Вільню, «каб пазначыць там беларускую прысутнасць». Кажуць, гэтая спроба каланізацыі скончылася дзэінтэграцыяй беларускай супольнасці і жыццёвымі расчараваннямі. Іх паслядоўнікі праз дваццаць гадоў могуць апынуцца значна больш паспяховымі ў справе «пазначэння прысутнасці». Найперш таму, што не бачаць перад сабой такой мэты. Сучасныя пярэбары моладзі ў Вільню — хутчэй справа абставінаў. Гэта блізка ад Беларусі, там недарагое жыццё, там можна атрымаць добрую адукацыю, а летувісы — зычлівыя і спагадлівыя людзі. І потым ужо — недзе паміж гіпермаркетам «Акрапаліс» і шэнгенскай візай — Вострая брама. Таня жыве ў Вільні, бо ў Беларусі на яе заведзеная крымінальная справа. Мы сядаем вячэраць ежай, купленай ва ўніверсаме.

Улетку 2006 года Тацццяну Елавую абвясцілі ў рэспубліканскі вышук як асобу, што мае дачыненне да дзейнасці новастворанага БУНТа. Хаваючыся ад следства, Таня аднойчы ўсё ж зайшла дадому — паесці і памыцца. Была ранняя раніца, але ў кватэры яна апынулася сама. Тут яе і высачылі. Дзяўчына не паддалася на прызыўнае: «Аткройце, міліцыя!», а зачынілася на ўсе замкі, забарыкадавалася і стала абзвоньваць баявых таварышаў. Тыя спачатку не давалі веры, што адбываецца нешта сур'ёзнае, але перапужанай Тані ўдалося іх расштурхаць. У выніку вакол Танінай кватэры сышліся сілы Святла і Цемры. Прычым адны сабраліся пад жалезнымі дзвярыма кватэры, а іншыя згрувасціліся пад Таніным балконам. Міліцыя выклікала слесара «ламаць замок і вязаць палітычнага». Але слесар ці то апынуўся «нашым чалавекам», ці то сапраўды забыўся на неабходны інструмент. Пакуль ён хадзіў па яго, Тані ўдалося змайстраваць вяроўкі і ратавацца цераз балкон з шостага паверху, дзе яе ўжо чакала машына. Літаральна праз пару хвілінаў дзверы зламалі.

Спробы схавацца між палёў і балот беларускай зямлі, у глушы, таксама апынуліся небяспечнымі. Адседжвалася Таня ў братняй Украіне, адкуль акурат да пачатку навучальнага года цішком перабралася ў Літву.

За жыццё Тацццяна адседзела шэсць адміністрацыйных тэрмінаў і мела каля ста прыводаў у міліцыю. БТ мае рацыю, кіраваць моладзевым супраціўам з Вільні ёй і сапраўды зручней. Прынамсі, бяспечней для здароўя. Хоць праблемы з КДБ паўстаюць нават у Літве.

## 22:15

Мне час ісці. На развітанне Таня, беражліва прыціскаючы да грудзей, выносіць мне нейкі чорны скрутак. Ім апынаецца саколка з надпісам: «БУНТ: хопіць чакаць! Дзейнічай!» На твары маёй гераіні — выраз кранальнай сур'ёзнасці, нібыта яна ўсю ноч уласнаручна вышывала для мяне гэту саколку. Я згадваю Танін расповед пра складанасці з фінансаваннем. Ну так, гэта амаль як вышывала.

## 00:00

Тацццяна Елавая мае каротка пастрыжаныя валасы. Але ззаду, па радыкальнай модзе, яна пакінула коску. Штовечар, у мэтах асабістай гігіены яна любоўна расплятае і заплятае яе на ноч. І выпадковым сведкам гэтай інтымнай працэдуры здаецца: яна вось-вось сядзе, падціснуўшы ногі, на падваконне і заспявае якую-небудзь цягучую песню.

СПАДЧЫНА

# Міхаіл Бабpоўскі. ВЯРТАННЕ МІНУЎШЧЫНЫ

Яўген ГЛІНСКІ

**У летапісе беларускага нацыянальнага адраджэння, як і ў летапісе навуковых дасягненняў першай паловы XIX стагоддзя, адно з выбітных месцаў належыць Міхаілу Бабpоўскаму. Вучонаму-гісторыку еўрапейскага ўзроўню, збіральніку старажытнасцяў, які вярнуў з нябыту імя і спадчыну Францыска Скарыны. Сёння ж з нябыту трэба вярнуць яго імя.**





Міхаіл Бабpоўскі нарадзіўся 8 (19) лістапада 1784 года ў вёсцы Вулька Бельскага павету (цяпер у складзе Польшчы) у шляхецкай сям'і. Яго бацька — Кірыл Бабpоўскі — паходзіў са старажытнага шляхецкага роду, які, праўда, да сярэдзіны XVIII стагоддзя збяднеў. Кірыл Бабpоўскі быў уніяцкім святаром і карыстаўся ўсеагульнай павагай за розум і больш чым саракагадовае служэнне Богу. Маці — Ганна з Крупіцкіх — таксама была шляхцянкай. Міхаіл навучаўся ў школе манаскага ордэну піяраў і беластоцкай гімназіі, якую, дарэчы, скончыў са срэбраным медалём. Поспехі ў навучанні не засталіся незаўважанымі, і Бабpоўскі быў пакінуты настаўнікам у школе, якую літаральна некалькі гадоў таму скончыў.

Але не гэта прадвызначыла далейшы лёс Міхаіла, і нават не тое, што ён вырашыў працягнуць справу бацькі і паступіў у Духоўную семінарыю пры Віленскім універсітэце. Вырашальным момантам для Бабpоўскага (а разам з ім і беларускага скарыназнаўства) сталі месца яго навучання і юнацкая цікаўнасць. Непадалёк ад Беластоку знаходзіўся Супрасльскі манастыр, які яшчэ ў часы Рэчы Паспалітай быў слаўны велізарным кнігазборам. Пры гэтым доступ да манастырскай бібліятэкі быў збольшага вольны, а для сына уніяцкага святара нагогул не было ніякіх перашкодаў. Бабpоўскі ўсе вакацыі праводзіў у Супраслі, дзе мог на свае вочы пабачыць старадрукі Скарыны і Швайпольта Фіёля. І не проста пабачыць, але і прачытаць, бо ў сям'і Бабpоўскіх размаўлялі па-беларуску, а Міхаіл з дзяцінства мог чытаць напісаныя кірыліцай уніяцкія кнігі для набажэнства.

У 1808 годзе Бабpоўскі мусіў пакінуць Беласток і пераехаць у Вільню, каб працягваць навучанне, але свае паездкі ў Супрасль не спыніў. У Вільні Бабpоўскі дасягнуў поспехаў не толькі ў тэалогіі (у 1812 годзе стаў магістрам філасофіі і тэалогіі). Ён займаўся літаратурай, грэцкай і лацінскай мовамі і яшчэ ў 1811 годзе стаў магістрам вольных мастацтваў.

Падчас вайны 1812 года вялікай актыўнасці Бабpоўскі не праяўляў. Ці то стала аддаваў перавагу навучы над палітыкай, ці то «паповіч» (так зняважліва называлі уніятаў у Віленскім універсітэце студэнты-каталікі) не праяўляў вялікай цікавасці да адраджэння Рэчы Паспалітай. Але як толькі вайна скончылася, пачаў вывучаць яшчэ і юрыспрудэнцыю, і новыя мовы — італьянскую і габрэйскую.

## Вялікае падарожжа

Здавалася, што выбар на карысць свецкіх навук Бабpоўскі ўжо зрабіў канчаткова, але тут яго запрашаюць выкладаць у Духоўнай семінарыі, і неўзабаве ён становіцца уніяцкім святаром. Але ўсё роўна асноўныя інтарэсы маладога святара і прафесара палягалі ў сферы мовазнаўства і гісторыі. У 1817 годзе яго накіравалі ў падарожжа па Еўропе для азнаямлення са станам тэалагічнай адукацыі ў іншых краінах і ўдасканалення ведаў у біблейскай гісторыі і ў славянскіх мовах.

За сваю пяцігадовую вандроўку ён наведаў Вену, Венецыю, Трыест, Мілан, Турын, Падую, Балонню, Фераву, Равену, Рым, Парыж, нямецкія дзяржавы. Але большую частку падарожжа правёў у славянскіх землях. Там ён пазнаёміўся і пасябраваў са знакамітымі чэшскімі нацыянальнымі «абуджальнікамі» Ёзафам Добраўскім, Вацлавам Ганкай, Ёзафам Юнгманам, слынным славенскім філолагам Ернэем Копітарам, харвацкімі дзеячамі. Менавіта Добраўскі ўвёў у навуковы абыходак «Малую падарожную кнігу».

За мяжой Міхаіл Бабpоўскі, як калісьці і Скарына, дасягнуў першых сапраўдных поспехаў. У 1820 годзе ў Венецыі ўдзельнічаў у сходзе даследчыкаў славянскіх старажытнасцяў, пасля ў Рыме склаў каталог старажытных славянскіх кніг Ватыканскай бібліятэкі, які высока ацаніў і надрукаваў у сваёй кнізе вядомы італьянскі лінгвіст Анджэла Маі.

Навуковыя пошукі Міхаіла Бабpоўскага прыцягнулі ўвагу вядомых мецэнатаў — князя Адама Чартарыйскага і графа Мікалая Румянцава. Але сродкаў усё роўна не хапала, у чым была вінаватая яго любоў да кніг. Ён сабраў вялікую бібліятэку па тэалогіі і славістыцы. Акрамя збірання старажытнасцяў, Бабpоўскі пісаў дзённік, філалагічныя і бібліяграфічныя нататкі, якія ўжо пасля вяртання дадому былі часткова надрукаваны ў віленскіх часопісах.

На радзіму Міхаіл Бабpоўскі вярнуўся ў 1822 годзе выключна адукаваным чалавекам. Адзін спіс моваў, якімі ён валодаў, выклікае павагу: польская, руская, сербская, харвацкая, балгарская, царкоўнаславянская, грэцкая, лацінская, габрэйская, халдзейская, сірыйская, арабская, нямецкая, французская, італьянская і англійская. Ягоны біёграф і пляменнік Павел Бабpоўскі называе яшчэ і «літоўска-славянскую», пад якой, відавочна, трэба разумець беларускую, што пацвярджаецца неадназовым прамаўленнем Бабpоўскім казанняў на беларускай мове.

## Час вялікіх адкрыццяў

Лета 1822 года, мабыць, нагадвала Бабpоўскаму яго юнацкія гады. Ён зноў прыехаў ва ўлюбёны Супрасль, да кніг, што здаўна абуджалі ў ім шчыры інтарэс. Цяпер гэты інтарэс быў навуковы. Падчас свайго знаходжання ў Італіі ён адшукаў першую друкаваную глагалічным шрыфтам кнігу — «Місал па закону Рымскага двара» (1483 г.). Магчыма, гэта дало яму падставу меркаваць, што і ў Супраслі ён знойдзе штосьці сапраўды значнае. Надзеі спраўдзіліся. Ды як! Яго знаходка стала сапраўднай навуковай сенсацыяй: рукапіс XI стагоддзя, які стаў вядомы як Супрасльскі кодэкс (рукапіс). Зрабіўшы яго навуковае апісанне, даследчык не даў веры сваім вачам: аказалася, што перад ім самы старажытны з вядомых кірылічных рукапісаў.

Лета 1822 года, як і наступны год, сталі надзіва плённымі ў пошуках Бабpоўскага: ён знайшоў друкаваныя кнігі Фіёля, відаць, тады ж адкрыў для сябе (а пасля і для ўсіх) выданні Скарыны, якія дакладна былі ў Супрасльскім манастыры. Але, іронія лёсу, гэтыя сапраўды найвыдатнейшая знаходкі на той момант не прывабілі навуковую грамадскасць, ды і сам Бабpоўскі пра іх пісаў мала. Тым не менш яго ролю ў вяртанні ведаў пра дзейнасць Скарыны недаацэньваць нельга.

## Пачынаюцца непрыемнасці

У 1823 годзе Бабpоўскі атрымаў наступную ганаровую вучоную ступень — доктара тэалогіі. Але праз год яго лёс рэзка змяніўся. 14 жніўня 1824 года з'явіўся загад, згодна з якім ён, разам з філосафам Юзафам Галухоўскім, гісторыкамі Яхімам Лялевелем і Ігнатам Даніловічам, быў звольнены з кафедры ва універсітэце з фармулёўкай «для спынення шкоднага ўплыву, які займела супрацьдзейная універсітэцкаму начальству партыя». Хутчэй за ўсё, пад гэтымі словамі разумелася сувязь чатырох прафесараў з філаматамі і філарэтамі, хаця ў адносінах да Бабpоўскага відавочных пацверджанняў гэтай сувязі не знайшлі. Але яго папулярнасць і сяброўства яшчэ са студэнцкіх часоў з Даніловічам маглі не падабацца рэктару Віленскага універсітэта Пелікану і апекуну навучальнай акругі Навасільцаву.

Зрэшты, біёграф нашага героя П. В. Бабpоўскі, жывучы і пішучы свой нарыс у Расійскай імперыі, імкнуўся давесці сваім чытачам, што вінаватымі ў звальненні Бабpоўскага былі манахі-базыльяне. Падстава для такой думкі была. Бабpоўскі ў сваіх царкоўных казаннях выступаў супраць набліжэння уніяцкай царквы да каталіцтва, што актыўна праводзілі базыльяне. Але наўрад ці уніяцкія манахі маглі знайсці падтрымку ў асобах Пелікана і Навасільцава.

Бабpоўскаму загадалі пасяліцца ў Жыровічах, ва уніяцкім манастыры, дзе яго напаткала чарговая непрыемнасць. З-за яго недагляду ад свечкі запаліліся паперы на стале, згарэлі многія навуковыя матэрыялы. Пасля гэтага ў навукоўца здарыўся нервовы зрыў.

## Часовы ўздым і зноў заняпад

Бабpоўскаму далі вярнуцца ў Вільню ў 1826 годзе. Ён актыўна ўключыўся ў грамадскае і навуковае жыццё, але праз сваю занятасць і страту ў пажары сваіх матэрыялаў не здолеў выдаць усе навуковыя працы, а перадусім найбольш значную «Гісторыю славянскіх друкарняў у Літве», у якой і распавядаў пра Францыска Скарыну. Але знайшоў іншую магчымасць уславіць беларускага першадрукара. У чэрвені 1826 года ён афіцыйна і публічна выступіў у абарону беларускай мовы перад польскасцю, прыводзячы як прыклад менавіта «Біблію» Скарыны.

На сваім шляху да беларускасці Бабpоўскі адыходзіў ад пануючай тады ў краі пальшчыны. Не падтрымаў паўстанне 1830–1831 гадоў і нават называў яго «нікчэмнай здрадай». Але менавіта закрыццё пасля паўстання Віленскага універсітэту сталася пачаткам канца навуковай кар'еры Бабpоўскага. Некаторы час ён яшчэ працаваў у Рымска-каталіцкай акадэміі ў Вільні, але магчыма з-за таго, што заставаўся уніятам, мусіў пакінуць і яе. Не вельмі добра ішлі ў яго справы і як святара. Нягледзячы на свой аўтарытэт і адукаванасць, не стаў епіскапам, хоць быў адным з галоўных прэтэндэнтаў на вакантныя пасады.

У другой палове 30-х гадоў у светапоглядзе Бабpоўскага наглядаецца рэзкая змена арыентціраў: ён становіцца актыўным прыхільнікам далучэння уніяцкай царквы да праваслаўнай. У чым тут прычына — сказаць цяжка. Магчыма, гэта было шчырае жаданне, бо яшчэ ў 20-я гады ён выступаў за ачышчэнне уніяцтва ад каталіцкіх уплываў, быў прыхільнікам славянафільскіх (якія часам злучаліся з русафільскімі) ідэй яшчэ з часоў вандроўкі па славянскіх землях. Не выключана, што сваю ролю адыгралі жыццёвыя расчараванні: вымушанае прыпыненне актыўнай навуковай дзейнасці, сціплае месца святара ў невялікім прыходзе ў Пружанскім павеце. Але, як бы тое ні было, у 1837 годзе Бабpоўскі абвясціў аб пераходзе ў праваслаўе. Аднак адначасова працягваў падпісваць лісты замежным карэспандэнтам як «прэсвітэр грэка-уніяцкай царквы».

Але яго ранейшая навуковая слава нагадала пра сябе. Яго старому знаёмаму Копітару спатрэбіўся старажытны кірылічны рукапіс, каб параўнаць яго са знойдзены глагалічным. Копітар звярнуўся да прафесараў Вастокава і Айхвальда, які ўзгадалі пра знойдзены, але не выдадзены Бабpоўскім Супрасльскі кодэкс. Вастокаў і Айхвальд заахвочвалі пераслаць яго Копітару для публікацыі. Апублікаваць сваю знаходку было марай нашага героя, але ён баяўся, што Копітар ці хтосьці іншы можа і не вярнуць каштоўную кнігу ў Супрасльскі манастыр. Урэшце, пагадзіўся дасылаць рукапіс для перапіскі Копітару па частках.

Бабpоўскі быў руплівым навукоўцам, які старанна працаваў над кожнай крыніцай, што можа пацвердзіць фрагмент яго лісту да прафесара Айхвальда: «Пры перапісцы я старанна назіраў, каб, згодна з пажаданнямі найвучонейшага мужа (маецца на ўвазе Е. Копітар — Я. Г.), старонка адпавядала старонцы, верш — вершу, слова — слову; такім жа чынам я захаваў словаскарачэнні, вершаметрычныя злучэнні і форму літар і знакаў прыпынку, і арфаграфічныя заўвагі, так што не дазволіў сабе ў сваёй копіі змяніць ніводнага знаку; такім самым чынам я не ўнікнуў другі раз прачытаць яе і выправіць памылкі».

Недарэмнай была перасцярога Бабpоўскага: адну частку Супрасльскага кодэкса Копітар усё ж затрымаў, а пасля смерці славенца ў 1844 годзе яна трапіла ў Люблянскую бібліятэку. Так Бабpоўскі страціў частку сваёй вялікай знаходкі. Мабыць, гэта вельмі засмуціла беларускага даследчыка. Апошнія свае гады ён правёў ціха, амаль усімі забыты. Памёр выдатны навуковец 21 верасня (3 кастрычніка) 1848 года ад халеры.

Засталася ягоная спадчына, ягоныя адкрыцці, што ўзбагацілі беларускую і сусветную культуру. Сапраўды, ён вярнуў беларусам Скарыну, заклаў пачаткі беларусазнаўства, дапамог Даніловічу раскрыць таямніцы беларуска-літоўскага летапісання, а значыць, і сярэднявечнай беларускай гісторыі. Супрасльскі кодэкс, знойдзены Бабpоўскім, у 2007 годзе быў уключаны ЮНЭСКА ў спіс «Памяць свету».

СВЯТА

# НА КАЛЯДНЫЯ ВАКАЦЫІ

Аляксей ХАДЫКА

**Час паміж агульнахрысціянскімі Калядамі 24 снежня і Божым Нараджэннем, якое па старому Юліянскаму календару Руская праваслаўная царква святкуе таксама 24 снежня, але па сучасным стылі гэта выпадае на 7 студзеня, зазвычай у талерантных беларусаў разглядаецца як выключна святочны. Сапраўды, нават калі ты не хрысціянскі вернік, чаму б не адсвяткаваць Божае нараджэнне спачатку з адным суседам, а потым з іншым? А пасярэдзіне — святкаваны шумна па савецкай завядзёнцы Новы год (бо калісьці на гэты дзень перавандравала забароненая весялосць рэлігійных святаў).**

Ва ўмовах фінансавага крызісу, які, як нам абяцалі, мусіць абысці захаваную ў надзейных руках крышталёвую пасудзіну, выключна ў гуманітарных мэтах адправіліся на гэты час у бясплатны адпачынак рабочыя шматлікіх заводаў і супрацоўнікі некаторых установ, уключаючы газету «Новы Час». Было б неразумным у абмаляванай сітуацыі не прадумаць для сябе план святочных мерапрыемстваў і не падзяліцца ім з чытачамі.

Калядная (як і Навагодняя) казка/быль — перадусім для маленькіх. Нехта ўпершыню ў жыцці асэнсоўвае ў храме таямніцу нараджэння Хрыста, а нехта жыве ў салодкіх марах пра снежную краіну Святога Мікалая / Санты Клауса / Дзеда Мароза.

З парадаў для бацькоў і пачнём, не кранаючы агульнавядомыя ранішнікі і дзяржаўныя елкі ў палацах.







Цудоўная **ВЫСТАВА АЎТАРСКІХ ЛЯЛЕК «ЗАПАВЕТНЫЯ ЖАДАННІ»** працуе з 18 снежня па 14 студзеня ў Музеі сучаснага мастацтва (пр. Незалежнасці, 47). Адчыняючы яе, дырэктар музея Васіль Шаранговіч нездарма сказаў, што лялькі суправаджаюць чалавецтва здаўна — ад Старажытнага Егіпта і нават раней. У лялькі — і гульня, і магія, і рытуал, і магчымасць дзіцяці дакрануцца да дарослага свету, а даросламу — прыгадаць бясхмарнае дзяцінства. Але трэба памятаць і сур'ёзнасць лялькі. А колькі літаратурных і кіношных лялек гадавалі цэлыя пакаленні людзей! Вось і на гэтай выставе — ёсць лялькі дарослыя і дзіцячыя. Да першых лепш далучыць працы маскоўскай мастачкі Ганны Карміліцынай — 20 прац са скуры, дрэва, пап'е-машэ, металу — экспазіцыйны дэбют аўтара «характарных» сур'ёзных работ дарослага цацачнага свету — ад «Майстэрні разбітых сэрцаў і душ» да «Я кахаю гэта». Апошняя работа — узор жартаўліва-эратычнай лялькі. Але на выставу можна смела выпраўляцца з малымі, бо сур'ёзныя ці, на першы погляд, табуяваныя тэмы прысутнічаюць тут у межах густу і педагагічнай дапушчальнасці. Тым больш што астатняя абсалютная большасць прац — вясёлыя і забаўныя персанажы, народжаныя фантазіяй прадстаўніц Майстэрні аўтарскай лялькі (МАЛ) у рамках праекту «Дэбют». Прадстаўлены працы выпускніц майстэрні, якіх, дарэчы, налічваецца ўжо больш за паўтары сотні. Дадаецца да лялек і цудоўная калекцыя жаночай біжутэрыі, над якой лялечніцы працуюць у дадатак да асноўнай спецыяльнасці.

Не забудземся і пра **ШВЕДСКІ ВЫСТАВАЧНЫ ПРАЕКТ «КАРЛСАН НА ДАХУ»**, прадстаўлены Шведскім музеем дзіцячай культуры ў Цэнтральнай гарадской дзіцячай бібліятэцы Мінска на праспекце Праўды, 20.

Пераходнаму ад дзіцячага да дарослага ўзросту, а таксама ўсім, хто не стаміўся адкрываць для сябе прыгажосць народнага мастацтва і стылізацый па яго матывах (ткацтва, кераміка, разьба, габелен, касцюм і бацік) раім да 17 студзеня наведаць **«КАЛЯДНУЮ ЗОРКУ» Ў ГАЛЕРЭІ УНІВЕРСІТЭТА КУЛЬТУРЫ**. Гэта традыцыйная студэнцкая, тым не менш цалкам прафесійна спелая, экспазіцыя да Каляд. На ёй у гэтым годзе разам з працамі навучэнцаў Універсітэта культуры выстаўляюцца работы студэнтаў БДПУ імя Максіма Танка. На ўсялякі выпадак нагадаем: у абодвух вышэйназваных музеях выходныя — у нядзелю і панядзелак.

У гэтыя дні адчынены Нацыянальны мастацкі музей (не працуе ў аўторак) на Леніна, 20. Тут да анансаванай намі папярэдне шыкоўнай выставы партрэтаў з калекцыі Нясвіжскага замка дадалася **ЭКСПАЗІЦЫЯ «БЕЛАРУСЫ»** сцэнічнага касцюма ансамбля «Харошкі» пад кіраўніцтвам Валянціны Гаявой. Яна паказана проста побач з партрэтамі. Многія ведаюць, што «Харошкі» захапляюцца рэканструкцыяй беларускага старадаўняга танца — таму па 19 снежня залы музея запоўніліся больш чым 30 шыкоўнымі вялікасвецкімі, шляхецкімі і простанароднымі касцюмамі, у асноўным выкананымі сямейнай парай мастакоў-мастацтвазнаўцаў у складзе Алены Юр'евай і Юрыя Піскуна. Ю. Піскун шмат часу аддаў не толькі жывапісу і мастацтву касцюма, але і дэталёваму вывучэнню старой беларускай культуры, таму падабенства жывапісу на сценах і гістарычнага духу ў касцюмах уражвае. Святочнае і феерычнае відовішча. Аматарам жа гламурнага кічу музей прапануе таксама шыкоўную магчымасць пабавіць час — на галерэі музея па 12 студзеня месціцца **«КАРНАВАЛ»** — дзесяткі работ Андрэя Смаляка. Мастак сам сябе вызначае як «геній». Экспазіцыя стракатая, уключае работы кшталту «Партрэта Філіпа Кіркорава на асле» і «Ружовага слана». Некаторыя творы не пазбаўлены свежасці і мастакоўскай шчырасці — «Каляды», «Папа Ян Павел ІІ», серыя вобразаў танцоўшчыц а-ля Дэга.

Завяршае калядны цыкл выстаў вялікая **ЭКСПАЗІЦЫЯ «КАЛЯДНЫ ФЭСТ»** работ сябраў Беларускага саюзу мастакоў, якая працуе ў Палацы мастацтва на Казлова, 3 па 18 студзеня. На момант напісання матэрыялу выстава яшчэ не адчынілася, але большасць апошніх праектаў у Палацы — удалая.

Не засмуціцца на святы і прыхільнікі левых ідэй. Музей айчыннай вайны на Кастрычніцкай плошчы з 29 снежня прэзентуе экспазіцыю «Patria o muerta! Venceremos!», створаную сумесна з Амбасадай Кубы да 55-годдзя



пераможнай кубінскай рэвалюцыі. Выстава паказвае этапы рэвалюцыі ад штурму казарм Манкада 23 ліпеня 1953 года, праз партызанскую вайну ў гарах Сьера-Маэстра да канчатковай перамогі рэвалюцыі 1 студзеня 1959-га. Ёсць у экспазіцыі раздзелы пра Карыбскі крызіс 1962 года, пра братоў Фідэля і Рауля Кастра і сённяшні дзень Кубы.

Затое Кітайская экспазіцыя нерыпрадставілі з 23 снежня ў Музеі гісторыі і культуры на Маркса, 12 фотапраект, цалкам прысвечаны тысячагадовай гісторыі сваёй краіны: **«КІТАЙ: 30 ГРАДУСАЎ ПАЎНОЧНАЙ ШЫРАТЫ»**. У межах Кітая 30-я паралель яўляе свету багатую палітру гістарычных, прыродных і этнаграфічных колераў. Яна праходзіць праз горныя хрыбты Гімалаяў і пераадольвае адлегласць у 5000 кіламетраў па тэрыторыі краіны. На 30-й паралелі размешчаны шматлікія помнікі сусветнай культурнай спадчыны, якія аб'ядноўваюць мінулае з сучаснасцю і сведчаць пра старажытнасць кітайскай цывілізацыі. На гэтай паралелі пражывае трэцяя частка насельніцтва Кітая. Гэта ў поўным сэнсе «Вялікі кітайскі ландшафтны шлях».

Зрэшты, сучаснае фотамастацтва — вельмі часта спосаб нестандартна зірнуць на сучаснасць і мінулае. Тым, хто падзяляе гэты тэзіс і атрымлівае задавальненне ад такога бачання, параім таксама наведаць (да 16 студзеня) **ВЫСТАВУ ЗМІЦЕРА РУСАКА «THE MINSK»** у галерэі «Zнята» кінатэатра «Цэнтральны». Спалучэнне тэхналагізму і рамантыкі — плюс погляд у мінскія аблокі над мінскімі сценамі і дахамі.

Прыемных Калядаў! Спадзяемся, прапанаваная музейная праграма не падасца вам сумнай.

АЛЬБОМ

# БЕЛАРУСКІ ХРЫСЦІЯНСКІ ХІТ

Алесь БЕЛАЗОР

**У Беларусі ў сетках распаўсюду з'явіўся ўжо другі альбом з серыі «Беларускі Хрысціянскі Хіт».**

Нагадаем, ідэя выдацоў, беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў — сабраць разам найлепшыя беларускамоўныя хрысціянскія спевы розных канфесіяў. Адабраныя кампазіцыі спачатку праходзяць ратацыю ў 10-ці хрысціянскіх фокус-групах (праваслаўнай, каталіцкай, грэка-каталіцкай, баптысцкай, поўнаевангельскай і г. д.) — і паводле адбору слухачоў фармуецца цэлая серыя альбомаў: «Беларускі Хрысціянскі Хіт», «Беларускі Калядны Хіт», «Бардаўскі Хрысціянскі Хіт», «Беларускі Хрысціянскі Рок», «Беларускі Хіт Пілігрыма», «Беларускі Літургічны Спеў», паводле канцэпцыі, кожны CD пачынаецца адной з версіяў нацыянальнага гімну «Магутны Божа» і заканчваецца варыянтам спеўнай малітвы «Ойча наш».

Першы альбом «Беларускі Хрысціянскі Хіт» стаў сапраўднай падзеяй у беларускай папулярнай музыцы. Надзвычай паспяховы CD давялося перавыдаваць: найбольшым попытам ён карыстаўся ў пратэстанцкіх грамадах, касцёле і сярод праваслаўнай моладзі.




У другі альбом увайшлі песні праслаўлення, якія звычайна выконваюцца падчас набажэнства, царкоўных ці касцельных акцый. Сярод выканаўцаў — вядомыя барды Алеся Унукоўская і Андрэй Мельнікаў, гурты «Тэзаўрус», «Псальмяры», «DVA», «Небасхіл», «Кадаш»; сярод аўтараў словаў — Ларыса Геніюш і інак Мікалай (Бембель).

Замовіць CD можна праз тэлефон (+37529)6560064 (Валянціна) або мэйл bhh@tut.by.

Дарэчы, ужо ў снежні чакаецца выхад трэцяга альбома «Беларускага Хрысціянскага Хіта» — «Хрыстос нарадзіўся!» — са зборам найлепшых беларускамоўных хітоў на Божае нараджэнне.

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 12 верасня 2008.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
chasnavinau@gmail.com; http://kamunikat.org/novy_chas.html

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет».
Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 26.12.2008. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.